

ВЯСНА
праваабарончы цэнтр

# Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам

2024

# Змест

Уступ....3

1. Прымяняльныя міжнародныя стандарты....4

2. Нацыянальнае заканадаўства....6

3. Уключэнне індывідаў, супольнасцяў, медыя, іншых суб'ектаў і інфармацыйных матэрыялаў у "экстрэмісцкія" і "тэрарыстычныя" пералікі....9

3.1. Пералік грамадзян, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці....9

3.2. Пералік экстрэмісцкіх фармаванняў....12

3.3. Спіс грамадзян і арганізацый, датычных да тэрарызму....12

3.4. Пералік матэрыялаў, прызнаных экстрэмісцкімі....13

4. Крымінальны пераслед....15

4.1. Абвінавачванні ў гвалтоўнай змене канстытуцыйнага ладу і (ці) тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь; захопе ці ўтрыманні дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам....15

4.2. Пераслед за "распаўсюд заведама непраўдзівых звестак пра палітычнае, эканамічнае, сацыяльнае, ваеннае ці міжнароднае становішча Рэспублікі Беларусь, прававое становішча грамадзян у Рэспубліцы Беларусь, якія дыскрэдытуюць Рэспубліку Беларусь"....19

4.3. Непрапарцыйны пераслед за абразу прадстаўнікоў улады....20

4.4. Распальванне варожасці і варажнечы....22

4.5. Пераслед стваральнікаў і ўдзельнікаў, а таксама за падтрымку "экстрэмісцкіх фармаванняў"....25

4.6. Хуліганства і крытыка дзяржаўных сімвалаў як формы экстрэмізму....27

4.7. Абвінавачванне ў тэрарызме і асуджэнне на працяглыя тэрміны пазбаўлення волі....30

4.8. Пераслед за распаўсюд "экстрэмісцкіх матэрыялаў", а таксама за выраб, выданне, захоўванне ці перавозку такіх матэрыялаў у мэтах распаўсюду....32

4.9. Пераслед за рэабілітацыю нацызму, прапаганду ці публічнае дэманстраванне, выраб, распаўсюд нацысцкай сімволікі і атрыбутыкі, а таксама захоўванне або набыванне такой сімволікі ці атрыбутыкі ў мэтах распаўсюду; пераслед за адмаўленне генацыду беларускага народа....34

4.10. Публічныя заклікі да экстрэмізму, а таксама публічнае апраўданне такіх дзеянняў....36

5. Спецыяльная вытворчасць....38

Высновы....41

# Уступ

Беларусь працягвае пагружацца ў атмасферу татальных рэпрэсій і запалохвання за любую праяву свабоды думкі і слова. Свабода сходаў, і раней максімальна абмежаваная, засталася ў мінулым: апанентамі рэжыму не было праведзена ніводнага мірнага сходу ў краіне за апошні год. Апраўданне дзяржаўнага тэрору праз выкарыстанне недэмакратычнага заканадаўства выглядае цынічным, у тым ліку і з прычыны ўжывання ў гэтых мэтах менавіта антытэрарыстычнага і антыэкстрэмісцкага заканадаўства. Аднак гэты хітрык працуе толькі дзеля таго, каб пераканаць рэпрэсіўны апарат ва ўяўнай законнасці ягоных дзеянняў па задушэнні правоў і свабод і пабудаваць неататалітарнае грамадства, улады якога пры дапамозе найноўшых інфармацыйна-тэхналагічных дасягненняў адкідаюць еўрапейскую дзяржаву ў катэгорыю сусветных ізгояў.

Міжнародныя арганізацыі аб'ектыўна ацанілі сітуацыю; так, УВКПЧ заявіла, што расшыраная трактоўка "экстрэмізму" несумяшчальная з прынцыпам законнасці і што ў Беларусі дзеля задушэння іншадумства выкарыстоўваліся законы аб экстрэмізме і барацьбе з тэрарызмам. Разам з тым адсутнасць рэальных механізмаў падсправаздачнасці прыводзіць сітуацыю да таго, што надзвычай грубыя парушэнні правоў чалавека, якія маюць усе прыкметы злачынстваў супраць чалавечнасці, адбываюцца беспакарана.

Папярэдні даклад Праваабарончага цэнтра "Вясна" на тую ж тэму быў прысвечаны аналізу паслядоўнага скарачэння межаў правоў і свабод, што актывізавалася пасля выбараў прэзідэнта Беларусі ў 2020 г., якія адбыліся з істотнымі парушэннямі і паклалі канец прызнанню рэжыму А. Лукашэнкі ў якасці легітымнай улады. Цяперашні даклад утрымлівае абноўленыя звесткі пра сітуацыю: у разгледжаным перыядзе — з сакавіка 2023 года па сакавік 2024-га — мы назіралі відавочнае нарошчванне рэпрэсіўных практык, аснову якім заклала заканадаўства, якое паслядоўна рэфармуецца ды абмяжоўвае грамадзянскія і палітычныя правы і свабоды пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам.

# 1. Прымяняльныя міжнародныя стандарты

Барацьба з тэрарызмам[1] і гвалтоўным экстрэмізмам як пажыўным асяроддзем для тэрарызму[2] з'яўляецца важнай задачай дзяржавы, аднак меры, якія рэалізуюцца, павінны быць збалансаваны з абавязальніцтвамі ў галіне правоў чалавека і не прыводзіць да злоўжыванняў[3].

Важна, каб падчас рэалізацыі антытэрарыстычных мер дзяржавы строга выконвалі міжнародныя абавязальніцтвы ў галіне правоў чалавека. У адпаведнасці з Сіракузскімі прынцыпамі, любыя абмежаванні, якія накладаюцца на правы і свабоды[4], павінны быць прадпісаны законам, мець законную мэту, быць неабходнымі ў дэмакратычным грамадстве і прапарцыйнымі пагрозе, без злоўжыванняў уладай ці неабгрунтаванага звужэння прасторы для свабоды выказвання меркаванняў і дзейнасці грамадзянскай супольнасці.

У гэтай сувязі важна звярнуцца да прынцыпаў законнасці і прававой акрэсленасці[5]. Згодна з Сіракузскімі прынцыпамі, законы, якія прадугледжваюць абмежаванне на карыстанне правамі чалавека, не павінны быць адвольнымі ці неабгрунтаванымі (прынцып 16). У адваротным выпадку празмерна шырокія і расплывістыя фармулёўкі прававых нормаў адкрываюць прастору для іх адвольнага тлумачэння і злоўжывання імі[6]. Акрамя таго, прававыя нормы, якія абмяжоўваюць карыстанне правамі чалавека, павінны быць дакладна выказаныя і даступныя кожнаму (прынцып 17). У гэтай сувязі, напрыклад, выключэнне слова "негвалтоўны" і далейшае шырокае тлумачэнне тэрміну "экстрэмізм" з'яўляецца prima facie падыходам, не адпаведным правам чалавека[7].

Ужыванне антыэкстрэмісцкага і антытэрарыстычнага заканадаўства не павінна ператварацца ў інструмент, які выкарыстоўваецца дзеля задушэння палітычнай апазіцыі ці крытыкі ўлады. Дзяржавы не павінны пераследваць якіх-небудзь "непажаданых" асобаў і арганізацыі грамадзянскай супольнасці пры дапамозе шырокага ўжывання антытэрарыстычных і антыэкстрэмісцкіх мер[8].

У кантэксце міжнародных нормаў правоў чалавека меры па барацьбе з тэрарызмам і экстрэмізмам разглядаюцца з улікам неабходнасці захавання балансу з правам на свабоду выказвання меркаванняў. Барацьба з тэрарызмам і экстрэмізмам часта цягне за сабой увядзенне абмежаванняў на свабоду выказвання меркавання[9]. Важна, каб такія абмежаванні не рабіліся інструментам, што выкарыстоўваецца дзеля неабгрунтаванага звужэння прасторы для адкрытага абмеркавання і крытыкі[10].

Свабода выказвання меркавання гарантавана артыкулам 19 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека (далей — УДПЧ) і артыкулам 19 Міжнароднага

[1] Дэкларацыя аб мерах па ліквідацыі міжнароднага тэрарызму.
[2] План дзеянняў па папярэджанні гвалтоўнага экстрэмізму, A/70/674 (2015).
[3] Даклад Спецыяльнай дакладчыцы ААН па барацьбе з тэрарызмам, A/HRC/40/52 (2019), п. 19.
[4] Маюцца на ўвазе правы і свабоды, гарантаваныя Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах.
[5] Venice Commission, Rule of Law Checklist.
[6] Даклад Спецыяльнай дакладчыцы ААН па Беларусі, A/HRC/53/53 (2023), п. 97.
[7] Даклад Спецыяльнай дакладчыцы ААН па барацьбе з тэрарызмам, A/HRC/43/46 (2020), п. 13.
[8] Даклад Спецыяльнай дакладчыцы ААН па барацьбе з тэрарызмам, A/HRC/40/52, п. 20.
[9] Даклад Спецыяльнай дакладчыцы ААН па барацьбе з тэрарызмам, A/HRC/40/52, п. 5.
[10] Там жа, п. 65.

пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах ((далей — МПГПП). Падрабязна палажэнні артыкула 19 МПГПП тлумачацца ў Заўвагах агульнага парадку № 34 Камітэта па правах чалавека. Умовы абмежавання свабоды выказвання меркавання сфармуляваны ў частцы 3 артыкула 19 МПГПП, раскрываюцца і тлумачацца ў Ёханэсбургскіх прынцыпах. Свабода выказвання меркавання можа быць абмежавана законнымі, недыскрымінацыйнымі, неабходнымі і адпаведнымі мерамі дзеля забеспячэння павагі правоў і рэпутацыі іншых асобаў ці дзеля аховы дзяржаўнай бяспекі, грамадскага парадку, здароўя і маральнасці грамадства (частка 3 артыкула 19 МПГПП).

Непасрэдную забарону міжнароднае права (ч. 2 арт. 20 МПГПП) накладае на выказванні на карысць:

a) прапаганды нянавісці;

b) прапаганды, якая ўяўляе сабой падбухторванне;

c) падбухторвання, якое можа прывесці да дыскрымінацыі, варожасці ці гвалту[11].

Пры гэтым патрабаванне наконт забароны не прадугледжвае абавязковай крыміналізацыі такіх выказванняў[12] — наадварот, крыміналізацыю павінны зазнаваць толькі сур'ёзныя выпадкі, даказаныя па-за разумнымі сумневамі[13]. Акрамя таго, вызначаныя міжнародным правам абмежаванні павінны тлумачыцца вузка і не ствараць пагрозы для самога права на свабоднае выказванне меркавання[14]. Забароне павінны падлягаць толькі выказванні меркавання, якія ўяўляюць сабой падбухторванне, — гэта значыць выказванні аб нацыянальных, расавых ці рэлігійных групах, што ствараюць непасрэдную пагрозу дыскрымінацыі, варожасці ці гвалту ў дачыненні да асобаў, што належаць да гэтых груп[15]. Кіруючыся гэтай логікай, Рабацкі план дзеянняў прапануе шасціступеньчаты парогавы тэст для вызначэння, калі выказванні могуць быць класіфікаваны як падбухторванне да гвалту і, такім чынам, могуць быць законна абмежаваны: ацэнку выказвання на прадмет кантэксту, аўдыторыі, аратара, наяўнасці намеру распаліць варожасць, імавернасці рэалізацыі такога намеру, зместу і формы выказвання.

[11] Даклад Спецыяльнага дакладчыка па свабодзе выказвання меркавання, A/67/357 (2012), п. 43.
[12] Даклад Спецыяльнага дакладчыка па свабодзе выказвання меркавання, A/74/486 (2019), п. 8.
[13] Камітэт па ліквідацыі расавай дыскрымінацыі, Агульная рэкамендацыя № 35 (2013), п. 12.
[14] Камітэт па правах чалавека, Заўвагі агульнага парадку № 34 (2011), п. 21.
[15] Даклад Спецыяльнага дакладчыка па свабодзе выказвання меркавання, A/74/486, п. 10, 13.

## 2. Нацыянальнае заканадаўства

Барацьба ўладаў са свабодай слова, у тым ліку пад прыкрыццём барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам, ажыццяўляецца з дапамогай артыкулаў Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях (далей — КаАП), артыкулаў Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей — КК), Закона Рэспублікі Беларусь "Аб процідзеянні экстрэмізму", Закона Рэспублікі Беларусь "Аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму", Закона Рэспублікі Беларусь "Аб генацыдзе беларускага народа", Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь "Аб меры процідзеяння экстрэмізму і рэабілітацыі нацызму" і інш.

Прававыя акты, якія, з пункту гледжання ўладаў, легалізуюць абмежаванні свабоды слова пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам, можна ўмоўна назваць антыэкстрэмісцкім і антытэрарыстычным заканадаўствам, якое было прааналізавана ў дакладзе "Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам", што ахоплівае перыяд да сакавіка 2023 года. У 2019 годзе праваабаронцамі быў праведзены падрабязны аналіз антыэкстрэмісцкага заканадаўства і былі сфармуляваны рэкамендацыі дзяржаве па паляпшэнні сітуацыі[16], аднак яны былі праігнараваны, а антыэкстрэмісцкае заканадаўства з таго моманту толькі пашыралася.

У перыяд з 1 сакавіка 2023 г. па 1 сакавіка 2024 г. антыэкстрэмісцкае заканадаўства было значна зменена і выкарыстоўваецца ўладамі дзеля апраўдання прыняцця новых рэпрэсіўных прававых актаў і адпаведнай практыкі.

Савет Бяспекі Рэспублікі Беларусь 6 сакавіка 2023 г. ухваліў[17] праект новай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (далей — Канцэпцыя), зацвярджэнне якой ускладаецца на Усебеларускі народны сход. У Канцэпцыі ўтрымліваюцца размытыя азначэнні паняццям "нацыянальная бяспека", "нацыянальныя інтарэсы", "пагроза нацыянальнай бяспецы", якія фігуруюць у дыспазіцыях артыкулаў КК. Прыкрываючыся занадта абстрактнай фармулёўкай нацыянальнай бяспекі — *"стан абароненасці нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь ад унутраных і вонкавых пагроз, які забяспечвае яе ўстойлівае развіццё"* — улады падводзяць пад яе ўсе альтэрнатыўныя выказванні і дзеянні, якія небяспечныя толькі суб'ектыўна для людзей, якія знаходзяцца дэ-факта ва ўладзе.

У новай версіі Канцэпцыі з'явіліся такія паняцці, як "электаральны суверэнітэт", "выклік нацыянальнай бяспецы" і "рызыка для нацыянальнай бяспекі". Калі "пагроза нацыянальнай бяспецы" азначалася як *"рэальна існуючая небяспека нанясення шкоды нацыянальным інтарэсам"*, то новыя паняцці ўключаюць у сябе дзеянні, што папярэднічаюць гэтаму і маюць толькі патэнцыйны характар: "выклік нацыянальнай бяспецы" тлумачыцца як *"небяспека нанясення шкоды нацыянальным інтарэсам, якая аб'ектыўна фармуецца"*, а "рызыка нацыянальнай бяспецы" — як *"небяспека нанясення шкоды нацыянальным інтарэсам, якая зараджаецца"*. Нягледзячы на крытыку, што рэгулярна выказваюць у адрас занадта шырокіх азначэнняў нацыянальнай бяспекі і яе пагроз, увядзенне новых паняццяў, якія драбняць ступень нанясення шкоды нацыянальным інтарэсам, да-

---

[16] Супрацьдзеянне экстрэмізму і правы чалавека, аналітычны даклад, 2019.

[17] Пастанова Савета бяспекі Рэспублікі Беларусь ад 6 сакавіка 2023 г. № 1 "Аб разглядзе праекта новай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь".

зваляе ўладам ажыццяўляць пераслед у яшчэ больш шырокіх маштабах за яшчэ менш акрэсленыя дзеянні ці выказванні.

У Канцэпцыі таксама было пашырана азначэнне "крыніц пагрозы нацыянальнай бяспецы". Ад моманту сцвярджэння Канцэпцыі гэта будзе не толькі *"фактар ці сукупнасць фактараў"*, але і *"суб'екты, якія іх прадукуюць"*. Такім чынам улады заканадаўча замацоўваюць магчымасці пераследу асобных людзей і арганізацый шляхам увядзення больш суровых мер, кантролю і ўзмацнення жорсткасці адказнасці.

Закон Рэспублікі Беларусь "Аб змене кодэксаў па пытаннях крымінальнай адказнасці" набыў моц 9 сакавіка 2023 г. Ад 1 кастрычніка 2023 г. дзейнічаюць наступныя змены, якія непасрэдна абмяжоўваюць свабоду слова і легалізуюць рэпрэсіі ў дачыненні да носьбітаў альтэрнатыўнага меркавання.

Так, у Крымінальны кодэкс быў уведзены артыкул з негвалтоўным складам злачынства "Прапаганда тэрарызму". Дыспазіцыя артыкула прадугледжвае *"распаўсюд у любой форме матэрыялаў і (ці) інфармацыі ў мэтах фармавання ў індывідуальна-неакрэсленага кола асобаў прыхільнасці да тэрарыстычнай ідэалогіі або прызнання тэрарыстычнай дзейнасці дапушчальнай"*. Калі пытанне з распаўсюдам зацэнзураванай альтэрнатыўнай дзяржаўнаму парадку дня інфармацыі вырашаецца ўладамі праз прыцягненне да адміністрацыйнай адказнасці пад выглядам распаўсюду "экстрэмісцкіх матэрыялаў"[18], то цяпер паводле такога ж прынцыпу, але з прыцягненнем да крымінальнай адказнасці, можа ўжывацца новы артыкул у Крымінальным кодэксе за "тэрарыстычныя ідэі", якімі таксама прызнаюцца і альтэрнатыўныя праўладным ідэям. Артыкул 289-1 КК прадугледжвае пакаранне ў выглядзе арышту, абмежавання волі на тэрмін да трох гадоў, ці пазбаўлення волі на той жа тэрмін са штрафам ці без штрафу. Другая частка артыкула вызначае павышаную адказнасць за тыя ж дзеянні, здзейсненыя спецыяльным суб'ектам, — асобай, асуджанай за здзяйсненне "экстрэмісцкіх" злачынстваў: у такім разе прадугледжана пакаранне да пяці гадоў абмежавання волі ці да сямі гадоў пазбаўлення волі са штрафам ці без.

На заканадаўчым узроўні былі зробленыя крокі ў кірунку ўзмацнення кантролю і застрашвання людзей шляхам пагрозы парушэння права на жыццё. У прыватнасці, у санкцыю артыкула 356 "Здрада дзяржаве" была ўведзена вышэйшая мера — смяротнае пакаранне. Таксама былі ўведзены змены ва Указ "Аб агульнавайсковых статутах Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь"[19], якія пашыраюць паўнамоцтвы вайскоўцаў ва ўжыванні сілы, уключаючы смяротную зброю. Калі раней *"ужыванне фізічнай сілы, спецыяльных сродкаў, зброі, баявой і спецыяльнай тэхнікі"* дазвалялася толькі ў выпадку немагчымасці іншымі спосабамі прадухіліць парушэнне, то цяпер гэта магчыма *"з улікам становішча, характару злачынства, адміністрацыйнага правапарушэння і асобы правапарушальніка"*. У такой фармулёўцы адсутнічаюць выразныя крытэры і дыферэнцыяцыя паміж сітуацыямі, калі ўжыванне зброі і сілы дапушчальнае. Заканадаўчы дазвол выкарыстоўваць як смяротную, гэтак і несмяротную зброю стварае ўмовы для адвольнага ўжывання сілы і замаху на жыццё чалавека, у тым ліку і ў палітычна матываваных сітуацыях.

---

[18] Арт. 19.11 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях.

[19] Арт. 11 Указа прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 чэрвеня 2001 г. № 355 "Аб агульнавайсковых статутах Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь" у рэд. ад 1 лютага 2024 г.

Санкцыі шэрагу артыкулаў КК, якія ўжываюцца паводле палітычных матываў, былі зробленыя больш жорсткімі праз даданне да пазбаўлення ці абмежавання волі дадатковага пакарання ў выглядзе штрафу, што з'яўляецца дадатковым інструментам для пакарання за правамерныя дзеянні, якія, тым не менш, адвольна праследуюцца ўладамі. Таксама ёсць імавернасць уліку заканадаўцам росту колькасці прысудаў, вынесеных завочна, пры якіх найболей імаверным з'яўляецца выкананне пакарання ў выглядзе штрафу за кошт маёмасці асуджаных, пакінутай на тэрыторыі Беларусі. Змены закранулі артыкулы КК: 293 (Масавыя беспарадкі), 357 (Змова ці іншыя дзеянні, здзейсненыя з мэтай захопу дзяржаўнай улады), 358 (Шпіянаж), 358-1 (Агентурная дзейнасць), 359 (Акт тэрарызму ў дачыненні да дзяржаўнага ці грамадскага дзеяча), 360 (Дыверсія), 361 (Заклікі да мераў абмежавальнага характару (санкцый), іншых дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь), 361-1 (Стварэнне экстрэмісцкага фармавання або ўдзел у ім), 361-2 (Фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці), 361-3 (Удзел на тэрыторыі замежнай дзяржавы ва ўзброеным фармаванні ці ўзброеным канфлікце, ваенных дзеяннях, вербаванне або падрыхтоўка асобаў да такога ўдзелу), 361-5 (Праходжанне навучання ці іншай падрыхтоўкі для ўдзелу ў экстрэмісцкай дзейнасці).

## 3. Уключэнне індывідаў, супольнасцяў, медыя, іншых суб'ектаў і інфармацыйных матэрыялаў у "экстрэмісцкія" і "тэрарыстычныя" пераліку

**Ёханэсбургскія прынцыпы**

**Прынцып 1.1. Усе абмежаванні павінны быць вызначаны законам.**

*(а) ... Закон павінен быць агульнадаступным, пэўным, канкрэтным і ясным з тым, каб дазволіць кожнаму чалавеку прадбачыць, ці з'яўляецца тое ці іншае дзеянне супрацьпраўным.*

Практыка вядзення органамі выканаўчай улады пералікаў інфармацыйных матэрыялаў, медыя, арганізацый і індывідаў працягвае быць інструментам пераследу за крытыку рэжыму. Падобныя спісы дазваляюць прыраўноўваць вялікія групы дзейных незалежных медыя і арганізацый грамадзянскай супольнасці да экстрэмісцкіх адным толькі рашэннем органа выканаўчай улады[20].

Індывіды пайменна ўключаюцца ў "Пералік грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян ці асобаў без грамадзянства, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці" і "Пералік арганізацый і фізічных асобаў, датычных да тэрарыстычнай дзейнасці". Акрамя таго, у "Пераліку арганізацый, фармаванняў, індывідуальных прадпрымальнікаў, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці", часам пайменна называюцца ўдзельнікі фармаванняў. Працэдура прыняцця рашэння аб непасрэдным уключэнні ў пералікі застаецца непразрыстай і закрытай для індывідаў і груп індывідаў, якіх у выніку туды ўносяць.

Як адзначана ў "Дакладзе аб сур'ёзнай пагрозе чалавечаму вымярэнню АБСЕ ў Беларусі з 5 лістапада 2020 года"[21], *"адсутнасць дакладнасці ў так званым "экстрэмізме" адбіваецца і на паняццях "экстрэмісцкія матэрыялы", "экстрэмісцкая дзейнасць", "экстрэмісцкая арганізацыя" і г. д. Мяркуючы па ўсім, працэдуры ўключэння ў спісы непразрыстыя і ў значнай ступені знаходзяцца ў руках выканаўчай улады з нераўнамерным удзелам судовых органаў".*

### 3.1. Пералік грамадзян, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці

Пералік грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян ці асобаў без грамадзянства, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці, публікуецца на сайце Міністэрства ўнутраных спраў.

На 29 лютага 2024 г. у пералік уключана 3 819 чалавек.

[20] Гл., напрыклад, Даклад Спецыяльнай дакладчыцы ААН па Беларусі, A/HRC/53/53, п. 41.

[21] Місія АБСЕ па выяўленні фактаў у Беларусі (2023 г.) у адпаведнасці з пунктам 12 Дакумента Маскоўскага механізму. Даклад аб сур'ёзнай пагрозе чалавечаму вымярэнню АБСЕ ў Беларусі з 5 лістапада 2020 года, прафесар Эрве Асенсіа, адзіны дакладчык.




Ад сакавіка 2023 г. па люты 2024 г. у яго дадалі 1 332 чалавек, што на 1 155 чалавек менш, чым за перыяд ад сакавіка 2022 г. па люты 2024 г.[22]

Гэта тлумачыцца тым, што ў папярэднім перыядзе ў пералік уключаліся людзі, асуджаныя за ўвесь час, пачынаючы з канца 2020 года, калі былі вынесены першыя прысуды за пратэсныя выступы 2020 года.

Падставай для ўключэння ў пералік з'яўляецца прысуд суда, што набыў моц, у сувязі са ўчыненнем дзеянняў, аднесеных Законам "Аб процідзеянні экстрэмізму" да экстрэмісцкай дзейнасці.

Сярод артыкулаў Крымінальнага кодэкса лідарамі з'яўляюцца:

- артыкул 342 КК (Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх) — 740 абвінавачванняў;
- артыкул 368 КК (Абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь) — 230 абвінавачванняў;
- артыкул 130 КК (Распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або іншай сацыяльнай варожасці ці варажнечы) — 202 абвінавачванні;
- артыкул 369 КК (Абраза прадстаўніка ўлады) — 142 абвінавачванні;
- артыкул 361-1 КК (Стварэнне экстрэмісцкага фармавання або ўдзел у ім) — 91 абвінавачванне.

Пераважная колькасць уключаных у пералік з 1 сакавіка 2023 г. па 29 лютага 2024 г. складаюць асуджаныя, якія адбываюць пакаранне: 702 чалавекі; на другім месцы — людзі з непагашанай судзімасцю: 632 чалавекі; далей — якія знаходзяцца ў вышуку: 14 чалавек; вызваленыя ад крымінальнай адказнасці: чатыры чалавекі; тыя, да каго ужыта адтэрміноўка ад выканання пакарання: адзін чалавек; тыя, да каго ўжыты прымусовыя меры бяспекі і лячэння: тры чалавекі; прымусовае лячэнне ў псіхіятрычным стацыянары са звычайным і строгім назіраннем: два чалавекі.

[22] ПЦ "Вясна", Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам, 2023, с. 12.

**Статус чалавека**




Мінімальны ўзрост чалавека, уключанага ў пералік, — 16 гадоў, максімальны — 74 гады.

**Узрост людзей, уключаных у пералік**




У пералік уключаюцца не толькі грамадзяне Беларусі, але і замежнікі, у дачыненні да якіх прысуд набыў моц. Так, пераважная большасць — 1 323 чалавекі — складаюць грамадзяне Беларусі; далей — пяць грамадзян Украіны; двое — Расіі; адзін — Польшчы; адзін — Узбекістана.

У адпаведнасці з абз. 5 ч. 6 арт. 18 Закона "Аб процідзеянні экстрэмізму", падставай выключэння грамадзян з пераліку з'яўляецца наяўнасць дакументальна пацверджаных звестак аб смерці грамадзяніна. Паводле стану на 10 сакавіка 2024 г. у пераліку знаходзяцца памерлыя зняволеныя:

| Памерлы зняволены | Месяц і год смерці | Нумар у пераліку |
|---|---|---|
| Мікалай Клімовіч[23] | травень 2023 | 2757 |
| Алесь Пушкін | ліпень 2023 | 210 |
| Вадзім Храсько | студзень 2024 | 3452 |
| Ігар Леднік | люты 2024 | 2164 |

[23] Дзень уключэння ў пералік супадае з датай смерці

## 3.2. Пералік экстрэмісцкіх фармаванняў

Пералік арганізацый, фармаванняў, індывідуальных прадпрымальнікаў, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці, публікуецца на сайце Міністэрства ўнутраных спраў. Парадак уключэння арганізацый, фармаванняў і ІП рэгулюецца Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 12 кастрычніка 2021 г. № 575 "Аб мерах процідзеяння экстрэмізму і рэабілітацыі нацызму".

Азначэнне тэрміну "экстрэмісцкае фармаванне" змяшчаецца ў ч. 4 арт. 1 Закона "Аб процідзеянні экстрэмізму". Экстрэмісцкае фармаванне — гэта група грамадзян, якая здзяйсняе экстрэмісцкую дзейнасць, або аказвае іншае садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці, або якая прызнае магчымасць яе ажыццяўлення ў сваёй дзейнасці, або якая фінансуе экстрэмісцкую дзейнасць, у дачыненні да якой прынята рашэнне Міністэрства ўнутраных спраў ці Камітэта дзяржаўнай бяспекі аб прызнанні яе экстрэмісцкай. Адпаведнае рашэнне прымаюць у пазасудовым парадку.

За 2023 год экстрэмісцкімі фармаваннямі былі прызнаны 62 суб'екты.

Камітэт дзяржаўнай бяспекі прыняў 26 рашэнняў "аб прызнанні групы грамадзян экстрэмісцкім фармаваннем і забароне яго дзейнасці", Міністэрства ўнутраных спраў — 35. Яшчэ адно рашэнне прынята Вярхоўным судом.

У 2023 годзе ў пералік былі ўключаны незалежныя медыя, сацыяльныя сеткі блогераў, музычны гурт, Telegram-каналы і чаты (нават закрытыя), грамадскія арганізацыі і ініцыятывы. За студзень-люты 2024 года — 12 суб'ектаў. Паводле стану на 29 лютага 2024 г. у пераліку налічваецца 181 пазіцыя.

У студзені 2024 г. спіс экстрэмісцкіх фармаванняў папоўніўся дзевяццю суб'ектамі, сярод якіх — незалежнае СМІ "Беларускае Радыя Рацыя", ініцыятыва "Вольны беларускі ўніверсітэт", ініцыятыва дапамогі сем'ям ахвяр палітычных рэпрэсій "INeedHelpBY" (падрабязней у частцы 4.4). У лютым 2024 г. у пералік былі ўключаны тры суб'екты.

## 3.3. Спіс грамадзян і арганізацый, датычных да тэрарызму

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 3 студзеня 2002 г. "Аб барацьбе з тэрарызмам", Камітэт дзяржаўнай бяспекі вядзе пералік арганізацый і фізічных асоб, датычных да тэрарыстычнай дзейнасці. Парадак вядзення вызначаны Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2014 г. № 1256 "Аб зацвярджэнні Палажэння аб парадку вызначэння пераліку арганізацый і фізічных асобаў, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, датычных да тэрарыстычнай дзейнасці, абскарджвання рашэння аб уключэнні арганізацыі, фізічнай асобы, у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка, у такі пералік і разгляду іншых зваротаў гэтых арганізацый, фізічнай асобы, у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка, давядзення гэтага пераліку да ведама асобаў, якія здзяйсняюць фінансавыя аперацыі, і органа фінансавага маніторынгу". Падставамі для ўключэння суб'ектаў у пералік з'яўляюцца:

- рашэнне Вярхоўнага Суда, якое набыло законную моц, аб прызнанні арганізацыі тэрарыстычнай (экстрэмісцкай), забароне яе дзейнасці і ліквідацыі, аб прызнанні замежнай ці міжнароднай арганізацыі тэрары-

стычнай (экстрэмісцкай), забароне яе дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і ліквідацыі пры наяўнасці прадстаўніцтва такой замежнай ці міжнароднай арганізацыі, размешчанага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

- пастанова аб прыцягненні фізічнай асобы ў якасці абвінавачанай і прысуд суда Рэспублікі Беларусь, што набыў законную моц, аб прызнанні фізічнай асобы вінаватай у здзяйсненні злачынстваў, прадугледжаных у артыкулах 124–131, 134, 287, 289–293, частцы 4 артыкула 294, частцы 4 артыкула 295, частцы 4 артыкула 309, частцы 3 артыкула 311, артыкулах 322–324, 359, 360 і 361 КК;
- спісы асобаў, якія ўдзельнічаюць у тэрарыстычнай дзейнасці, датычныя да распаўсюду зброі масавага паражэння або знаходзяцца пад кантролем такіх асобаў. Гэтыя спісы асобаў мусяць прызнавацца ў Рэспубліцы Беларусь і складацца міжнароднымі арганізацыямі ці ўпаўнаважанымі імі органамі, пры наяўнасці акалічнасцяў і дзеянняў, якія аб'ектыўна існуюць і ствараюць пагрозу нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь;
- прысуды ці рашэнні судоў, іншых кампетэнтных органаў замежных дзяржаў у дачыненні да такіх асобаў, што прызнаюцца ў Рэспубліцы Беларусь у адпаведнасці з міжнароднымі дамовамі Рэспублікі Беларусь.

За апошні год (да канца студзеня 2024 года) пералік тэрарыстычных арганізацый папоўніўся адной арганізацыяй — "ХУСИТЫ", з прычыны ўключэння гэтай арганізацыі ў Санкцыйны пералік Камітэта Савета Бяспекі ААН; беларускімі арганізацыямі гэты пералік не папаўняўся.

З сярэдзіны сакавіка 2023 года (часу складання папярэдняга дакладу) да лютага 2024 года ў пералік дадалі 163 чалавекі, з іх 10 — з прычыны ўключэння ў Санкцыйны пералік Камітэта Савета Бяспекі ААН, астатнія — згодна з рашэннем беларускіх уладаў; сярод іх — грамадзяне Рэспублікі Беларусь і адзін грамадзянін Украіны.

125 з іх абвінавачваліся паводле арт. 130 КК у распальванні варожасці ці варажнечы, 9 — паводле арт. 289 КК у здзяйсненні акту тэрарызму, 32 — паводле арт. 361 КК у закліках да мер абмежавальнага характару (санкцый), іншых дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы.

## 3.4. Пералік матэрыялаў, прызнаных экстрэмісцкімі

Распачатая ў 2008 годзе практыка прызнання інфармацыйнай прадукцыі экстрэмісцкай і вядзення Рэспубліканскага спісу экстрэмісцкіх матэрыялаў зрабілася асабліва актыўнай, рэгулярнай і сістэмнай пасля падзеяў 2020 года. Рэзкае папаўненне спісу звязана з тым, што ўлады канчаткова ссунулі фокус з прадукцыі, якая сапраўды можа быць экстрэмісцкай, нацысцкага, неанацысцкага і рэлігійнага зместу, на тую, якая з'яўляецца непажаданай з пункту гледжання рэжыму: калі яна змяшчае альтэрнатыўны пункт гледжання, а таксама калі з'яўляецца апазіцыйнай, нацыянальна арыентаванай, культурнай і спрыяе салідарнасці людзей. Уключэнне інфармацыйных матэрыялаў рознага характару і кшталту ў гэты спіс прадугледжвае іх забарону і адміністрацыйную адказнасць за ўзаемадзеянне з ёю на падставе арт. 19.11 КаАП (Распаўсюд, выраб, выданне, захоўван-

не ці перавозка ў мэтах распаўсюду) з накладаннем спагнання ў выглядзе штрафу, грамадскіх прац ці адміністрацыйнага арышту.

На момант напісання дакладу агулам у спісе налічваецца больш за 4 300 пазіцый. З 1 сакавіка 2023 г. спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў папоўніўся на звыш як 1 800 адзінак шляхам вынясення больш як 1 000 рашэнняў судоў, у адпаведнасці з якімі экстрэмісцкімі матэрыяламі могуць прызнавацца ад аднаго да неабмежаванай колькасці пазіцый.

*# Суд Чыгуначнага раёна г. Гомеля 4 ліпеня 2023 г. за адно судовае пасяджэнне прызнаў адразу 105 інфармацыйных прадуктаў экстрэмісцкімі матэрыяламі.*

Працэс прызнання прадуктаў экстрэмісцкімі матэрыяламі нельга назваць аб'ектыўным, празрыстым і экспертным. Ацэнка ажыццяўляецца паводле палітычных матываў сябрамі камісій, якія адначасова займаюць дзяржаўныя пасады ці маюць сувязь з дзяржаўнымі структурамі, ды без належнага аналізу і абгрунтавання. Паўнамоцтвы па ацэнцы на прадмет наяўнасці прыкмет праявы экстрэмізму ўскладаюцца на рэспубліканскую (для г. Мінска) і абласныя камісіі. Пры гэтым на заканадаўчым узроўні да іх выстаўляюцца размытыя патрабаванні адносна складаў, задач, правоў і абавязкаў сябраў камісіі, а таксама рэгламенту прыняцця рашэнняў.

Інфармацыйнай прадукцыяй, якая прызнаецца экстрэмісцкімі матэрыяламі, у большай ступені з'яўляецца прадукцыя ў інтэрнэце: сайты, Telegram-каналы і чаты, персанальныя старонкі, блогі, музычныя кампазіцыі і кліпы і г. д. Тым не менш экстрэмісцкімі прызнаюцца і тэксты, якія могуць быць у друкаваным выглядзе, а таксама сімволіка і атрыбутыка. Утрыманне экстрэмісцкіх матэрыялаў, прызнаных такімі з 1 сакавіка 2023 г., — гэта матэрыялы палітычных партый і грамадскіх рухаў, мастацкая літаратура, актыўнасць беларускіх дыяспар за мяжой, салідарнасць з рэпрэсаванымі і інш.

## 4. Крымінальны пераслед

### 4.1. Абвінавачванні ў гвалтоўнай змене канстытуцыйнага ладу і (ці) тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь; захопе ці ўтрыманні дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам

**Ёханэсбургскія прынцыпы**

**Прынцып 7. Выказванне меркаванняў, якое знаходзіцца пад абаронай**

*(а) У адпаведнасці з прынцыпамі 15 і 16, мірнае ажыццяўленне права на свабоду выказвання меркавання не павінна разглядацца як пагроза нацыянальнай бяспецы ці зазнаваць абмежаванні або пакаранне. Выказванне меркавання, якое не складае пагрозу нацыянальнай бяспецы, уключае, але не абмяжоўваецца выказваннямі, якія:*

*(i) выступаюць за негвалтоўную змену палітыкі ўрада ці змену самага ўрада.*

Крымінальным кодэксам прадугледжана адказнасць за "змову ці іншыя дзеянні, здзейсненыя з мэтай захопу дзяржаўнай улады", згодна з арт. 357: змова ці іншыя дзеянні, здзейсненыя з мэтай захопу ці ўтрымання дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам, а таксама захоп або ўтрыманне дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад 8 да 15 гадоў; захоп ці ўтрыманне ўлады неканстытуцыйным шляхам, якія пацягнулі гібель людзей або спалучаны з забойствам, караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да дваццаці пяці гадоў са штрафам ці без штрафу, ці пажыццёвым пазбаўленнем волі, ці смяротным пакараннем.

Агулам з 2021 года вынесены прысуды ў дачыненні да не менш як 27 чалавек, абвінавачаных у гэтым злачынстве. Сярод іх палітыкі і грамадскія актывісты, удзельнікі грамадскіх ініцыятыў і пратэсных супольнасцяў.

У канцы 2020 года мішэнямі для адвольнага пераследу сталі сябры Кардынацыйнай рады **Марыя Калеснікава** і **Максім Знак**. 21 снежня стала вядома, што, згодна з даручэннем Генпракуратуры, Следчы камітэт распачаў крымінальную справу аб змове з мэтай захопу ўлады неканстытуцыйным шляхам (частка 1 артыкула 357 КК). Фігурантаў справы абвінавацілі ў тым, што яны сумесна з іншымі асобамі не пазней за 16 ліпеня 2020 года ўвайшлі ў таемную змову з мэтай захопу дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам. *"Асновай для рэалізацыі такой задумы паслужыла паспяхова апрабаваная ў шэрагу краін методыка змены ўлады незаконным шляхам. Яна прадугледжвала акумуляванне прадстаўнікоў пратэснага руху для фармавання неарганізаванай масы людзей як інструменту дасягнення мэтаў і спосабу фармавання пратэснага настрою ўдзельнікаў. Методыка была адаптавана да беларускай грамадзянскай супольнасці і сучаснага ўзроўню развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій... У адпаведнасці з планам, яны ў розных месцах, абвясціўшы і пазіцыянуючы сябе прадстаўнікамі пераважнай большасці грамадзян Беларусі, рыхтавалі і публіч-*

*на агучвалі заявы аб перамозе на выбарах кандыдаткі Ціханоўскай С. Г., страце народам Беларусі даверу да органаў улады і кіравання, слабасці дзейснай улады. Заклікалі да "страйкаў" на дзяржаўных прадпрыемствах з высоўваннем выключна палітычных патрабаванняў як легальнага спосабу выказвання свайго меркавання. Неаднаразова наўпрост і ў завуаляванай форме заклікалі да прызнання выбараў несапраўднымі, а дзейснага кіраўніка дзяржавы — нелегітымным"*. Такім чынам, публічная палітычная дзейнасць, выказванні, заснаваныя на аб'ектыўных фактах, заклікі да негвалтоўных формаў грамадзянскага непадпарадкавання зрабіліся асновай для адвольнага абвінавачвання ў здзяйсненні злачынства, аднесенага Крымінальным кодэксам да катэгорыі асабліва цяжкіх.

Таксама ў віну грамадскім дзеячам паставілі заяву аб стварэнні паводле ініцыятывы **Святланы Ціханоўскай** *"так званай "кардынацыйнай рады" як адзінага прадстаўнічага органа беларускага грамадства для арганізацыі перадачы ўлады. Хаваючы свой матыў, у якасці афіцыйнай мэты стварэння "кардынацыйнай рады" яны заявілі арганізацыю працэсу пераадолення палітычнага крызісу, забеспячэнне згоды ў грамадстве, а таксама абарону суверэнітэту і незалежнасці Беларусі"*. Разам з тым, на думку Генеральнай пракуратуры, сапраўднай мэтай стварэння Кардынацыйнай рады з'яўлялася *"каардынацыя пратэснай актыўнасці, у тым ліку па арганізацыі і правядзенні дзеянняў, накіраваных на захоп дзяржаўнай улады і змену палітычнага кіраўніцтва неканстытуцыйным шляхам..."* Абвінавачаныя былі асуджаныя ў закрытым судовым пасяджэнні.

**Рыгор Кастусёў**, **Аляксандр Фядута** і **Юрый Зянковіч** былі асуджаны згодна з ч. 1 арт. 357 КК за "змову з мэтай захопу дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам": шэраг палітыкаў і актывістаў падчас некалькіх сустрэч у фармаце відэаканферэнцыі абмяркоўвалі магчымыя шляхі змены кіраўніцтва краіны; пры гэтым Юрый Зянковіч і Аляксандр Фядута сталі ахвярамі правакацыі з боку беларускіх спецслужбаў і былі ўведзены ў зман адносна гатовасці беларускіх вайскоўцаў падтрымаць звяржэнне рэжыму А. Лукашэнкі.



У Мінскім гарадскім судзе 6 сакавіка 2023 года ў завочным парадку асудзілі **Святлану Ціханоўскую**, **Паўла Латушку**, **Вольгу Кавалькову**, **Марыю Мароз**, **Сяргея Дылеўскага.** Усім абвінавачаным інкрымінавалі змову з мэтай захопу дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам (ч. 1 арт. 357 КК): у адпаведнасці з версіяй Генеральнай пракуратуры, *"Ціханоўская, Мароз, Кавалькова, Латушка і Дылеўскі ў розны час увайшлі ў таемную злачынную змову, у тым ліку з іншымі асобамі, з мэтай захопу дзяржаўнай улады. Пасля размеркавання функцый актыўна выконвалі свае ролі ў злачынстве, што, акрамя іншага, выяўлялася ў распрацоўцы плану і механізму захопу ўлады і наладжванні ўзаемадзеяння з адміністратарамі радыкальных і дэструктыўных інтэрнэт-рэсурсаў, прадстаўнікамі структур, зацікаўленых у змене палітычнага кіраўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь; планаванні і арганізацыі пратэсных несанкцыянаваных масавых мерапрыемстваў і беспарадкаў; падрыхтоўцы і агучванні заяў і заклікаў, накіраваных на стварэнне ўмоў для захопу дзяржаўнай улады і аблягчэння нелегітымнай перадачы паўнамоцтваў органаў улады прадстаўнікам пратэснай апазіцыі, якую прадстаўлялі ўдзельнікі змовы"*. Акрамя таго, *"Ціханоўская, знаходзячыся на тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі, абвясціла сябе пераможцай выбараў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і адзінай нацыянальнай лідаркай, абранай беларускім народам. Заявіла аб стварэнні заведама неканстытуцыйнай "Кардынацыйнай рады" дзеля забеспячэння трансферу ўлады, сапраўдныя мэты якой — каардынацыя пратэснай дзейнасці, забеспячэнне росту пратэсных настрояў і сацыяльнай напружанасці ў грамадстве ў якасці неабходных умоваў для захопу ўлады. У прэзідыум (кіраўнічы орган) "Кардынацыйнай рады" ўвайшлі ў тым ліку Кавалькова, Латушка і Дылеўскі. Латушка ў кастрычніку 2020 года абвясціў аб стварэнні "Народнага антыкрызіснага кіравання", мэтамі якога абвешчаны "забеспячэнне завяршэння выканання функцый дзеючымі органамі ўлады і стабілізацыя сістэмы кіравання Рэспублікай Беларусь пасля пераходу ўлады да народа" (насамрэч — да асобаў, якія ўваходзяць у склад удзельнікаў змовы). У адкрытым доступе быў апублікаваны распрацаваны ўдзельнікамі змовы "План перамогі", мэта якога — аказанне "неверагоднага ціску на рэжым" і ўзвядзенне на пасаду прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ціханоўскай. Ціханоўская, з'яўляючыся адной з арганізатарак дзейнасці і стваральніц экстрэмісцкага фармавання "Рабочы Рух", узяла ўдзел у планаванні, арганізацыі і каардынацыі правядзення работнікамі розных суб'ектаў гаспадарання Рэспублікі Беларусь, у першую чаргу, дзяржаўнай формы ўласнасці, якія маюць крытычна важны характар, адначасовага агульнарэспубліканскага страйку, які пярэчыць заканадаўству, дзеля падрыву нацыянальнай эканомікі і ўзмацнення санкцый"*.

Справа паводле гэтага і яшчэ шэрагу іншых цяжкіх і асабліва цяжкіх абвінавачванняў была разгледжана ў завочным парадку, з грубым парушэннем прынцыпаў справядлівага правасуддзя. За адкрытую легітымную негвалтоўную палітычную і грамадскую дзейнасць абвінавачаныя былі асуджаны да працяглых тэрмінаў зняволення.

Паказальным у сэнсе абсалютнага грэбавання правам і здаровым розумам стала крымінальная справа ў дачыненні да **Іллі Шапаткоўскага** — аднаго з кіраўнікоў платформы "Сумленныя людзі". На думку абвінавачвання, *"прадстаўнікі экстрэмісцкіх ячэек грамадства ў 2020 годзе, яшчэ задоўга да пачатку электаральнага працэсу, разгарнулі маштабную інфармацыйную кампанію па дыскрэдытацыі дзеючых органаў дзяржаўнай улады і выбарчага працэсу. З мэ-*

*тай запуску інфармацыйнага шуму была створана падкантрольная экстрэмістам сетка інтэрнэт-рэсурсаў, Telegram-каналаў і псеўдаініцыятыў, якія актыўна спрыялі распальванню сацыяльнай варожасці ў грамадстве, псіхалагічнаму маніпуляванню грамадскай свядомасцю з ужываннем шырокага комплексу палітычных тэхналогій. Яркі прыклад такой падкантрольнай ініцыятывы — "Сумленныя людзі", адным з кіраўнікоў якой з'яўляўся Шапаткоўскі. Абвінавачаны адказваў за дэструктыўны інфармацыйны парадак дня, размяшчаючы медыяматэрыялы, накіраваныя выключна на нанясенне шкоды рэпутацыі дзяржаўных органаў, праваахоўнага блоку і прадстаўнікоў улады. Мэта інфармацыйнага парадку — закласці зерне сацыяльна-палітычнага супрацьстаяння ў грамадстве. Нягледзячы на тое, што Шапаткоўскі, асцярожнічаючы, не ўваходзіў у непасрэдную змову па захопе ўлады, ён актыўна падзяляў ідэі злачынных фармаванняў і спрыяў ім у дасягненні акрэсленых мэтаў шляхам забеспячэння інфармацыйнага суправаджэння, культываваў і прапагандаваў у грамадстве пратэсныя настроі, тым самым дзяліў беларусаў на "сваіх" і "чужых" паводле прынцыпу іх стаўлення да дзейснай улады"*. Такім чынам, легітымная грамадская дзейнасць па мабілізацыі выбарнікаў у мэтах забеспячэння празрыстасці выбарчых працэсаў, дзейнасць у падтрымку незалежнага кандыдата была адвольна паднесена як злачынная, штучна злучана з пратэснымі выступамі, якія з'явіліся пасля грубай і цынічнай фальсіфікацыі вынікаў выбараў 2020 года: *"Гэтая дзейнасць фармавала радыкальна настроеныя групы і акумулявала іх у выглядзе натоўпу, які бясчынствуе на вуліцах, у тым ліку паблізу выбарчых участкаў. Так званую "жывую сілу" экстрэмісты імкнуліся выкарыстоўваць як асноўны інструмент дзеля дасягнення злачынных мэтаў і сілавога захопу ўлады"*.

Апошняй вядомай справай, што змяшчае абвінавачванні паводле арт. 357 КК, стала разгледжаная ў Мінскім гарадскім судзе ў межах спецыяльнай вытворчасці, паводле якой 15 лютага 2024 года асудзілі заснавальнікаў і экс-удзельнікаў арганізацыі былых сілавікоў з ініцыятывы BYPOL **Аляксандра Азарава**, **Матвея Купрэйчыка**, **Ігара Лобана**, **Андрэя Астаповіча**, **Уладзіміра Жыгара** і **Алега Талерчыка.** Суддзя Дзіна Кучук прызначыла фігурантам справы паводле 13 крымінальных артыкулаў ад 11 да 25 гадоў зняволення і штраф на агульную суму больш як 350 000 еўра. Ініцыятыва BYPOL была створана ў кастрычніку 2020 года былымі сілавікамі, якія выступаюць супраць рэпрэсій і гвалту і не згодныя з палітыкай А. Лукашэнкі. У лістападзе 2021 года BYPOL прызналі "экстрэмісцкім фармаваннем", а ў канцы жніўня 2022 года Вярхоўны суд Беларусі прызнаў арганізацыю "тэрарыстычнай".

## 4.2. Пераслед за "распаўсюд заведама няпраўдзівых звестак пра палітычнае, эканамічнае, сацыяльнае, ваеннае ці міжнароднае становішча Рэспублікі Беларусь, прававое становішча грамадзян у Рэспубліцы Беларусь, якія дыскрэдытуюць Рэспубліку Беларусь"

Арт. 369-1 КК "Дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь" прадугледжвае адказнасць за *"распаўсюд заведама няпраўдзівых звестак, якія дыскрэдытуюць Рэспубліку Беларусь, пра палітычнае, эканамічнае, сацыяльнае, ваеннае ці міжнароднае становішча Рэспублікі Беларусь, прававое становішча грамадзян у Рэспубліцы Беларусь, дзейнасць дзяржаўных органаў, што быў здзейснены ў публічным выступе, або ў друкаваным творы, або ў творы, што публічна дэманструецца, або ў сродках масавай інфармацыі, або ў інфармацыі, размешчанай у глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт, накіраваны на прычыненне істотнай шкоды дзяржаўным ці грамадскім інтарэсам"* і па-ранейшаму выкарыстоўваецца ўладамі дзеля задушэння свабоды слова і пераследу палітычных апанентаў рэжыму. Фармулёўка дыспазіцыі артыкула адпавядае азначэнню адной з формаў экстрэмізму, дадзенага адпаведным законам. Падрабязны аналіз правамернасці ўжывання гэтых нормаў быў прыведзены ў папярэднім дакладзе на гэтую ж тэму.

Са спасылкамі на Ёханэсбургскія прынцыпы было адзначана, што сапраўднай мэтай легітымнага абмежавання правоў у інтарэсах нацыянальнай бяспекі з'яўляецца абарона існавання краіны ці яе тэрытарыяльнай цэласнасці ад ужывання ці пагрозы ўжывання сілы, альбо магчымасці краіны супрацьстаяць ужыванню ці пагрозе ўжывання сілы, што ідзе з вонкавай ці ўнутранай крыніцы. Рэпутацыя дзяржавы не з'яўляецца легітымнай мэтай для ўвядзення абмежаванняў свабоды выказвання меркавання.

Таксама падкрэслівалася, што, паводле дыспазіцыі арт. 369-1 КК, дзеянне павінна быць накіравана на *"прычыненне істотнай шкоды дзяржаўным ці грамадскім інтарэсам"*, і ў кожным вядомым выпадку суды дэманструюць адвольнае пашыральнае тлумачэнне гэтых паняццяў, якое не раздзяляе інтарэсы дзяржавы і кіруючага рэжыму.

Праваабаронцам вядома пра 28 асуджаных з лета 2020 года паводле абвінавачвання ў дыскрэдытацыі Рэспублікі Беларусь. За апошні год згодна з гэтым артыкулам было асуджана не менш як 12 чалавек.

Такім чынам, пераслед у адпаведнасці з арт. 369-1 КК "Дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь" за выказванне альтэрнатыўнага меркавання і крытыкі дзеючых уладаў застаецца непрапарцыйнай рэакцыяй, прыводзіць да пазбаўлення волі абвінавачаных у межах дасудовага ўтрымання пад вартай і пазбаўлення або абмежавання волі як крымінальнага пакарання, што з'яўляецца непрымальным.

### 4.3. Непрапарцыйны пераслед за абразу прадстаўнікоў улады

Артыкул 369 КК "Абраза прадстаўніка ўлады" крыміналізуе *"абразу прадстаўніка ўлады ці яго блізкіх у сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў, зробленую ў публічным выступе, або ў друкаваным творы, або ў творы, які публічна дэманструецца, або ў сродках масавай інфармацыі, або ў інфармацыі, размешчаной у глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт"*. Максімальнае пакаранне паводле часткі 1 гэтага артыкула складае тры гады пазбаўлення волі.

Артыкул 368 КК "Абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь" крыміналізуе вузейшы ў адносінах да папярэдняга артыкула спектр дыфамацыйных правапарушэнняў — публічную абразу прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У гэтым выпадку спосаб здзяйснення правапарушэння вызначаецца не праз пералік дзеянняў, як у выпадку абразы прадстаўніка ўлады, а праз адзначэнне характарыстыкі публічнасці дзеяння, што дае вялікія магчымасці для пашыральнага тлумачэння. Максімальная санкцыя за абразу прэзідэнта Рэспублікі Беларусь складае чатыры гады пазбаўлення волі, а за здзяйсненне асобай, раней асуджанай за абразу ці паклёп, або злучанае з абвінавачваннем у здзяйсненні цяжкага ці асабліва цяжкага злачынства (ч. 2 арт. 368 КК) — пяць гадоў пазбаўлення волі.

Артыкул 391 КК "Абраза суддзі ці народнага засядацеля" прадугледжвае адказнасць за *"абразу суддзі ці народнага засядацеля ў сувязі з ажыццяўленнем імі правасуддзя"*. Максімальная санкцыя — абмежаванне волі на тры гады. Падрабязны аналіз правамернасці ўжывання гэтых нормаў прыведзены ў папярэднім дакладзе на гэтую ж тэму.

Абвінавачванні паводле згаданых артыкулаў заснаваныя на канстатаванні негатыўнай ацэнкі ў дачыненні да службовай асобы і/ці блізкіх прадстаўніка ўлады, што парушае прынцып роўнасці перад законам і роўнасці абароны закона.

**Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах**

**Артыкул 26**

*Усе людзі роўныя перад законам і маюць права без аніякай дыскрымінацыі на роўную абарону закона. У дачыненні да гэтага ўсякага кшталту дыскрымінацыя павінна быць забароненая законам, і закон павінен гарантаваць усім асобам роўную і эфектыўную абарону супраць дыскрымінацыі па якой бы там ні было прыкмеце, у тым ліку расы, колеру скуры, полу, мовы, рэлігіі, палітычных ці іншых перакананняў, нацыянальнага ці сацыяльнага паходжання, маёмаснага становішча, нараджэння ці іншай акалічнасці.*

Згодна са звесткамі, якія мы маем, у 2023 годзе паводле арт. 368 КК асуджана 324 чалавекі, паводле арт. 369 КК — 187.

Праваабаронцам вядома пра 33 асуджаных за студзень–люты 2024 года паводле арт. 368 КК, 23 — паводле арт. 369 КК, двух — паводле арт. 391 КК.

За перыяд з сакавіка 2023 г. па люты 2024 г. у Пераліку грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян ці асобаў без грамадзянства, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці, утрымліваецца 386 абвінавачванняў паводле артыкулаў:

- 368 КК — 230;
- 369 КК — 142;
- 391 КК — 14.

Галоўным чынам асобы асуджаныя за каментары, пакінутыя у сацыяльных сетках.

*# **Канстанцін Саламіюк** прысудам суда Маскоўскага раёна горада Брэста ад 14 лютага 2024 г. асуджаны да пазбаўлення волі на два гады згодна з ч. 1 арт. 368 КК за публічную абразу Лукашэнкі.*

*# **Аляксандр Малікаў** прысудам суда Лідскага раёна Гродзенскай вобласці ад 24 студзеня 2024 г. прызнаны вінаватым у абразе прадстаўніка ўлады паводле арт. 369 КК і асуджаны да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу тэрмінам на адзін год і шэсць месяцаў і штрафу ў памеры 4 000 беларускіх рублёў (больш за 1 100 еўра). У снежні 2021 года абвінавачаны пакінуў у адной з сацыяльных сетак каментар у адрас камандзіра вайсковай часткі, якая базуецца ў Лідскім раёне; абвінавачванне і суд палічылі гэтае паведамленне абразлівым.*

*# **Ала Зуева** прысудам суда Бабруйска і Бабруйскага раёна ад 2 кастрычніка 2023 г. прызнаная вінаватай паводле арт. 369 КК (Абраза прадстаўніка ўлады) і ч. 1 арт. 368 КК (Абраза Лукашэнкі) і асуджаная да двух з паловай гадоў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму і штрафу ў памеры 50 базавых велічыняў (1 850 рублёў) і 2 000 беларускіх рублёў кампенсацыі маральнай шкоды двум пацярпелым за каментары ў Telegram.*

*# **Сяргей Соц** асуджаны 15 верасня 2023 г. судом Цэнтральнага раёна г. Мінска згодна з ч. 1 арт. 368, арт. 369, арт. 391 КК. Прысуд — два гады пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.*

## 4.4. Распальванне варожасці і варажнечы

Частка 1 артыкула 1 Закона "Аб процідзеянні экстрэмізму" паказвае, што экстрэмісцкая дзейнасць можа здзяйсняцца шляхам *"распальвання расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або іншай сацыяльнай варожасці ці варажнечы, палітычнай ці ідэалагічнай варожасці, варожасці ці варажнечы ў дачыненні да якой-небудзь сацыяльнай групы, у тым ліку ажыццяўлення ў згаданых мэтах супрацьпраўных дзеянняў супраць грамадскага парадку і грамадскай маральнасці, парадку кіравання, жыцця і здароўя, асабістай свабоды, гонару і годнасці асобы, маёмасці"*.

Распальванне варожасці і варажнечы крыміналізаванае артыкулам 130 КК, які прадугледжвае адказнасць за *"наўмысныя дзеянні, накіраваныя на распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або іншай сацыяльнай варожасці ці варажнечы паводле прыкметы расавай, нацыянальнай, рэлігійнай, моўнай ці іншай сацыяльнай прыналежнасці"*.

Пачынаючы ад сакавіка 2023 года прынамсі 120 чалавек было затрымана паводле арт. 130 КК, і з іх 106 чалавек асуджана. Агульнай практыкай застаецца[24] разгляд судамі падобных спраў у закрытым судовым пасяджэнні, што груба парушае працэсуальныя правы абвінавачаных і зводзіць да мінімальнай ацэнку дакладнасці, дастатковасці і дапушчальнасці якіх бы там ні было доказаў абвінавачвання.

Распаўсюджанай практыкай стала выстаўленне абвінавачванняў паводле арт. 130 КК у межах спецыяльнай вытворчасці (гл. частку 4.8) апазіцыйным палітыкам і іншым публічным персонам, якія крытыкуюць дзеючыя ўлады.

**Агульная рэкамендацыя № 35 (2013) Камітэта па ліквідацыі расавай дыскрымінацыі**

*12. Камітэт рэкамендуе пакінуць крымінальную адказнасць для сур'ёзных выпадкаў, даказаных па-за разумнымі сумневамі, а меней сур'ёзныя сітуацыі варта разглядаць без ужывання крымінальнага заканадаўства з улікам, у прыватнасці, характару і маштабаў наступстваў для асобаў ці груп асобаў, супраць якіх была накіравана адпаведная дзея.*

Артыкул 130 КК крыміналізуе шырокі спектр выказванняў, не абмяжоўваючыся найболей сур'ёзнымі формамі падбухторвання. Суды не праводзяць ацэнку выказванняў на адпаведнасць крытэрам, якія дазваляюць класіфікаваць ненавісніцкае выказванне як падбухторванне. Стандартная фармулёўка экспертных лінгвістычных высноваў, на якую звычайна спасылаюцца суды як на доказ вінаватасці, — *"у выказванні ўтрымліваецца негатыўная ацэнка"*.

Адказнасць за распальванне варожасці і варажнечы без абцяжарвальных акалічнасцяў прадугледжана ч. 1 арт. 130 КК; за тыя ж дзеянні, злучаныя з гвалтам, — ч. 2 арт. 130 КК; калі яны былі здзейсненыя групай асобаў ці пацягнулі цяжкія наступствы, у тым ліку смерць чалавека, — ч. 3 арт. 130 КК.

[24] ПЦ "Вясна", Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні 15 палітычных зняволеных, 14 красавіка 2023 г.

Магчымасць дэпрывацыі свабоды — крымінальнага пакарання ў выглядзе пазбаўлення ці абмежаванні волі, а таксама дасудовай меры стрымання ў выглядзе ўтрымання пад вартай — не ранжыруецца па сур'ёзнасці формаў падбухторвання.

**Сіракузскія прынцыпы**

*4. Тлумачэнне абмежаванняў павінна адбывацца з улікам характару і кантэксту, у якім існуе кожнае з правоў, што абмяжоўваецца.*

*7. Адвольнае ўжыванне абмежаванняў не дапускаецца.*

**Даклад Вярхоўнага камісара па правах чалавека да 22-й сесіі Савета па правах чалавека, A/HRC/22/17/Add.4**

*11. ... Абмежаванні павінны быць сфармуляваны такім чынам, каб было ясна, што іх адзінай мэтай з'яўляецца абарона асобных асобаў і супольнасцяў, якія належаць да этнічных, нацыянальных ці рэлігійных груп.*

На практыцы артыкул 130 КК селектыўна выкарыстоўваецца дзеля пераследу з мэтай абароны інстытутаў улады. У выніку легітымная мэта абароны ўразлівых груп падмяняецца абаронай прадстаўнікоў улады — супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, вайскоўцаў і г. д., якія адносяцца, наадварот, да прывілеяванай групы[25].

*# **Дзяніс Красько** асуджаны да трох гадоў пазбаўлення волі згодна з арт. 130 КК. У адпаведнасці з матэрыяламі абвінавачвання, ён "апублікаваў у адкрытым доступе ў сетцы Інтэрнэт каментары, накіраваныя на падтрыманне экстрэмісцкай дзейнасці, прапаганду і агітацыю сацыяльнай варожасці і варажнечы ў дачыненні да супрацоўнікаў дзяржаўных праваахоўных органаў Рэспублікі Беларусь, прадстаўнікоў судовай улады, вайскоўцаў, якія праходзяць службу ва Узброеных сілах Рэспублікі Беларусь".*

*# Крымінальная справа супраць праваабаронцы **Насты Лойкі** дэманструе тэндэнцыю ўладаў скажона інтэрпрэтаваць палажэнні аб распальванні варожасці і варажнечы дзеля пераследу за распаўсюд інфармацыі аб парушэннях правоў чалавека: нагодай для асуджэння праваабаронцы паводле арт. 130 КК стаў удзел у напісанні дакладу "Пераслед анархістаў, антыфашыстаў, левых і сацыяльных актывістаў у Беларусі" за 2017–2018 год, дзе даецца крытычная ацэнка дзейнасці супрацоўнікаў міліцыі. Мінскі гарадскі суд 20 чэрвеня 2023 года прызначыў праваабаронцы сем гадоў пазбаўлення волі.*

[25] ПЦ «Вясна», Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам, 2023 г., с. 35.



Такія справы пераважна датычаць выказванняў у інтэрнэце — публікацый рознага кантэнту з крытыкай рэжыму і негатыўнымі выказваннямі аб прадстаўніках улады, каментароў у сацыяльных сетках і публічных чатах.

У шэрагу выпадкаў крымінальныя справы датычаць не публічных выказванняў, а перадачы розным пратэсным суб'ектам персанальных звестак прадстаўнікоў улады. У якасці "распальвання іншай сацыяльнай варожасці" маецца на ўвазе публічны распаўсюд інфармацыі наконт датычнасці чыноўнікаў і супрацоўнікаў сілавых структур да парушэнняў правоў чалавека. Згодна з такой логікай пераследуецца перадача персанальных звестак прадстаўнікоў улады ў "Чорную кнігу Беларусі" — пратэсны Telegram-канал.

*# **Наталля Лашч**, якая з'яўлялася супрацоўніцай пракуратуры Фрунзенскага раёна горада Мінска, асуджаная да шасці гадоў пазбаўлення волі ў адпаведнасці з арт. 130 і арт. 179 КК (Незаконны збор і распаўсюд звестак аб прыватным жыцці) за перадачу звестак "Чорнай кнізе Беларусі".*

*# **Павел Петручэня**, які з'яўляўся супрацоўнікам Дэпартамента аховы Міністэрства ўнутраных спраў, асуджаны да шасці гадоў пазбаўлення волі паводле арт. 130 КК за перадачу звестак "Чорнай кнізе Беларусі".*

У асобных выпадках практыка вылучэння ў якасці сацыяльнай групы, якая падлягае абароне, прадстаўнікоў пэўнай прафесіі распаўсюджваецца не толькі на чыноўнікаў і супрацоўнікаў сілавых структур, але і на прадстаўнікоў улады ў шырэйшым сэнсе.

*# **Юрый Ташкінаў** асуджаны да трох гадоў пазбаўлення волі згодна з арт. 130 КК за негатыўныя каментары ў інтэрнэце ў дачыненні да супрацоўнікаў дзяржаўных СМІ.*

## 4.5. Пераслед стваральнікаў і ўдзельнікаў, а таксама за падтрымку "экстрэмісцкіх фармаванняў"

Крымінальны кодэкс вызначае адказнасць за кіраўніцтва экстрэмісцкім фармаваннем — паводле ч. 1 арт. 361-1 (максімальная санкцыя — сем гадоў пазбаўлення волі са штрафам), за ўдзел у экстрэмісцкім фармаванні — паводле ч. 3 арт. 361-1 (максімальная санкцыя — шэсць гадоў пазбаўлення волі са штрафам), за фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці — паводле арт. 361-2 (максімальная санкцыя — восем гадоў пазбаўлення волі са штрафам) і за садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці — арт. 361-4 (максімальная санкцыя — сем гадоў пазбаўлення волі са штрафам).

Пераслед стваральнікаў і кіраўнікоў экстрэмісцкага фармавання ажыццяўляецца ў адпаведнасці з ч. 1 арт. 361-1, удзельнікаў — у адпаведнасці з ч. 3 арт. 361-1 і арт. 361-2 КК. Таксама ў межах арт. 361-2 і арт. 361-4 КК пераследуюцца асобы, якія аказвалі ці аказваюць падтрымку дзейнасці (у выглядзе ахвяраванняў, перадачы інфармацыі, інтэрв'ю і г. д.) арганізацый і груп грамадзян, прызнаных уладамі экстрэмісцкім фармаваннем.

Ад сакавіка 2023 года як мінімум 150 чалавек было затрымана ў адпаведнасці з гэтымі артыкуламі Крымінальнага кодэкса, і з іх 134 чалавекі асуджаныя.

**Ёханэсбургскія прынцыпы**

**Прынцып 1.1. Усе абмежаванні павінны быць вызначаны законам**

*(а) ... Закон павінен быць агульнадаступным, пэўным, канкрэтным і ясным з тым, каб дазволіць кожнаму чалавеку прадбачыць, ці з'яўляецца тое ці іншае дзеянне супрацьпраўным.*

Прынцып *nullum crimen sine lege* (няма злачынства без закона) патрабуе выразнага прадпісання правапарушэння ў законе, каб у момант ажыццяўлення дзеяння чалавек мог дакладна вызначыць, ці з'яўляецца яно крымінальна каральным або не, дзеля забеспячэння прававой прадказальнасці ці прадбачнасці. Хаця дзейнасць і падтрымка экстрэмісцкіх фармаванняў наўпрост крыміналізаваная, вельмі шырока і расплывіста сфармуляванае антыэкстрэмісцкае заканадаўства[26] не дазваляе адназначна выявіць, ці падпадае тое ці іншае дзеянне пад акрэсленыя забароны ажно да абвяшчэння ўладамі Беларусі арганізацыі і групы індывідаў экстрэмісцкім фармаваннем. У той жа час, згодна з наяўнай практыкай, арганізацыя ці група грамадзян прызнаецца экстрэмісцкім фармаваннем ад самага пачатку сваёй дзейнасці, а не ад даты прыняцця рашэння. І гэта дае ўладам Беларусі магчымасць ажыццяўляць крымінальны пераслед за дзеянні, якія не з'яўляюцца крымінальна каральнымі на момант іх здзяйснення. Падобная практыка падрывае прадказальнасць прававой базы і прыводзіць да парушэння

[26] ПЦ «Вясна», Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам, 2023 г., с. 61.; Працоўная група ААН па адвольных затрыманнях, Меркаванне № 64/2023 у адносінах да Віталя Брагінца (Беларусь), A/HRC/WGAD/2023/64, п. 78-79.

шэрагу надзвычай важных працэсуальных правоў асобаў, якім былі выстаўлены абвінавачванні пры такіх акалічнасцях.

Пераслед паводле арт. 361-2 КК (Фінансаванне дзейнасці экстрэмісцкага фармавання) актыўна ўжываецца за ахвяраванні ў фонды салідарнасці і іншыя арганізацыі грамадзянскай супольнасці.

*# **Алесю Лянцэвіч** асудзілі да трох гадоў і шасці месяцаў пазбаўлення волі згодна з арт. 361-2 (Фінансаванне дзейнасці экстрэмісцкага фармавання), арт. 368 (Абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь), арт. 369 КК (Абраза прадстаўніка ўлады). Абвінавачванне ў фінансаванні экстрэмісцкага фармавання было выстаўлена за ахвяраванні ў 2020 годзе ў фонды салідарнасці "BySOL" і "ByHelp", якія былі прызнаныя экстрэмісцкімі фармаваннямі 3 і 14 снежня 2021 года адпаведна.*

*# **Пётр Ярмашук** асуджаны да чатырох гадоў пазбаўлення волі паводле арт. 361-2 (Фінансаванне дзейнасці экстрэмісцкага фармавання) і арт. 354 КК (Распрацоўка, выкарыстанне, распаўсюд або збыт шкодных камп'ютарных праграм). Абвінавачванне ў фінансаванні экстрэмісцкага фармавання было выстаўлена за ахвяраванне 19 жніўня 2020 года фонду салідарнасці "BYSOL" (прызнаны экстрэмісцкім фармаваннем 3 снежня 2021 года).*

**Сіракузскія прынцыпы**

*15. Ніводнае абмежаванне ажыццяўлення правоў чалавека не ўводзіцца інačай, як у адпаведнасці з нацыянальным законам агульнага прымянення, які не супярэчыць Пакту і дзейнічае ў момант увядзення абмежавання.*

Камітэт дзяржаўнай бяспекі працягваў актыўна выклікаць людзей, якія рабілі ахвяраванні ў фонды салідарнасці і арганізацыі грамадзянскай супольнасці, пасля прызнаныя ўладамі экстрэмісцкімі фармаваннямі. Падобныя выклікі знаходзяцца па за прававым полем і не афармляюцца працэсуальна. Супрацоўнікі органаў дзяржаўнай бяспекі ставяць ультыматум: яўка з пакаяннем і залічэнне ахвяравання на рахунак дзяржаўнай арганізацыі — або завядзенне крымінальнай справы. Таксама праваабаронцам вядомыя выпадкі прапановы перадачы грошай наяўнымі супрацоўніку органаў дзяржаўнай бяспекі.

Фармальнай падставай для такой практыкі з'яўляецца заўвага да арт. 361-2 КК, паводле якой "*асоба, што здзейсніла фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці паводле гэтага артыкула, калі яна своечасова заявіла пра здзейсненае і (ці) іншым чынам спрыяла прадухіленню ці выяўленню гэтага злачынства*". У некаторых выпадках пасля залічэння ахвяравання сапраўды выносіліся пастановы аб адмове ў завядзенні крымінальнай справы. Тым не менш праваабаронцам вядомыя факты, калі падобныя выклікі паўтараліся па другім коле.

Анлайн-платформа дапамогі сем'ям палітычных зняволеных "INeedHelp", якая звязвала сем'і палітвязняў і людзей, гатовых аплаціць ім дастаўку прадуктаў харчавання, была прызнаная экстрэмісцкім фармаваннем 16 студзеня 2024 года. Улады пачалі масавыя вобшукі жылля і затрыманні тых, хто атрымліваў дапамогу. Вядома пра пераслед не менш як 287 чалавек і затрыманне не менш як 100 чалавек. У дачыненні да атрымальнікаў дапамогі без належнай прычыны распачынаецца крымінальны працэс, пасля выносяцца пастановы аб адмове ў завядзенні крымінальнай справы, і на гэтай падставе аднаўляецца прапушчаны тэрмін для распачынання справы аб адміністрацыйным правапарушэнні за парушэнне заканадаўства аб выкарыстанні замежнай бязвыплатнай дапамогі.

*# Х. прызналі вінаватай у адміністрацыйным правапарушэнні за тое, што яна "атрымала і выкарыстоўвала ў асабістых мэтах замежную бязвыплатную дапамогу ў выглядзе таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў, [...] пералічаных прадстаўнікамі экстрэмісцкага фармавання "INeedHelp" [...] у адрас ЗАТ "Інтэрнэт крама "Еўраопт" [...]", чым стварыла "пагрозу прычынення шкоды дзяржаўным і грамадскім інтарэсам".*

## 4.6. Хуліганства і крытыка дзяржаўных сімвалаў як формы экстрэмізму

Як адна з формаў экстрэмізму расцэньваюцца дзеянні, прадугледжаныя арт. 339 КК (Хуліганства) і здзейсненыя ў мэтах "распальвання расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або іншай сацыяльнай варожасці ці варажнечы, палітычнай ці ідэалагічнай варожасці, варожасці ці варажнечы ў дачыненні да якой-небудзь сацыяльнай групы". Дыспазіцыя артыкула прадугледжвае *"наўмысныя дзеянні, якія груба парушаюць грамадскі парадак і выказваюць яўную непавагу да грамадства, суправаджаюцца ўжываннем гвалту ці пагрозай яго ўжывання або знішчэннем ці пашкоджаннем чужой маёмасці або вылучаюцца па сваім змесце надзвычайным цынізмам (хуліганства)"*. Санкцыя артыкула ўтрымлівае пакаранне абмежаваннем волі да двух гадоў ці пазбаўленнем волі да трох гадоў, а калі дзеянні зробленыя паўторна або групай асобаў (злоснае хуліганства) — да шасці гадоў пазбаўлення волі і да трох гадоў абмежавання волі.

Гэты артыкул нярэдка ўжываецца дзеля пераследу людзей, якія выказваюць сваё меркаванне ў выглядзе розных дзеянняў, што знаходзіцца пад абаронай права на выказванне меркавання ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі.

*# Суд Іванаўскага раёна 10 красавіка 2023 г. вынес прысуд 36-гадоваму мантажніку **Дзмітрыю Жыдко**, які абвінавачваецца паводле ч. 1 арт. 339 КК у хуліганстве. У адпаведнасці з матэрыяламі справы, 27 лютага 2022 г. мужчына падчас правядзення рэспубліканскага рэферэндуму знаходзіўся на выбарчым участку, размешчаным у Іванаўскім раённым цэнтры культуры і народных традыцый, нібы ў стане алкагольнага ап'янення. Атрымаўшы бюлетэнь для галасавання, Дзмітрый пакінуў на ім непрыстойны надпіс у адрас кіраўніка дзяржавы. Пасля, не апусціўшы бюлетэнь у скрыню для галасавання, абвінавачаны прад'явіў яго ў разгорнутым выглядзе сябрам камісіі, чым парушыў працу выбарчага ўчастку. На бюлетэні быў зроблены надпіс "Лукашэнка і Пуцін, .... жахлівым чынам". Мужчыну было прызначана пакаранне два гады пазбаўлення*

*волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму, з улікам амністыі гэты тэрмін скарочаны на адзін год.*

Пры гэтым, у адсутнасць гарантый справядлівага судовага разгляду, Дзмітрый быў прыцягнуты да адказнасці двойчы: спачатку згодна з арт. 19.1 КаАП (Хуліганства), а пасля паводле ч. 1 арт. 339 КК. Такая практыка з'яўляецца распаўсюджанай і ўжо характэрнай прыкметай палітычна матываванага пераследу.

*# Прысуд **Уладзіміру Савельеву**, **Юрыю Несцярэнку**, **Ігару Цікачу**, **Ігару Цяпцееву** і **Віктару Грынько** паводле шэрагу артыкулаў КК, у тым ліку ч. 2 арт. 339 КК, быў вынесены 15 чэрвеня 2023 г. На пачатку кастрычніка 2022 г. у Маскоўскім раёне Мінска на апоры лініі электраперадач невядомыя вывесілі бел-чырвона-белы сцяг і сцяг Украіны. У Telegram-канале Антона Матолькі ("МотолькоПомоги" — адзін з папулярных Telegram-каналаў, прызнаны экстрэмісцкім фармаваннем) на наступны дзень з'явіўся допіс са здымкам сцяга і подпісам: "Мінчукі віншуюць українскі народ з цудоўнымі навінамі з крымскага моста. Крим — це Україна! Жыве Беларусь! Слава Україні!". Вядома, што Ігару Цяпцееву было прызначана пазбаўленне волі ў калоніі агульнага рэжыму тэрмінам 3,5 года, якія тэрміны прысуджаны астатнім фігурантам справы — невядома.*

Абвінавачванне ў "хуліганстве" часта ідзе разам з абвінавачваннем паводле дыфамацыйных артыкулаў за крытыку дзяржаўных службоўцаў і дзяржаўных сімвалаў, што крыміналізавана ў арт. 370 КК (Знявага дзяржаўных сімвалаў). Гэты артыкул актыўна ўжываецца з 2020 года, праваабаронцам вядома пра не менш як 171 вынесены прысуд у перыяд з 2020 па 2023 год. Праз тое, што дзяржаўныя сімвалы могуць зазнаваць крытыку і абразы ў межах свабоды выказвання меркавання (Ёханэсбургскія прынцыпы), дзяржаўная сімволіка не павінна фігураваць у абвінавачваннях у якасці вызначальнай прыкметы.

Вядомыя асобы некаторых асуджаных за крытыку дзяржаўных сімвалаў з 1 сакавіка 2023 г. Да аднаго года пазбаўлення волі асуджаны **Алег Воўк**, **Вадзім Барысаў**, **Валерый Самсоненка**. **Ірына Санкоўская** за каментары з крытыкай ў дачыненні да прадстаўнікоў улады і дзяржаўных сімвалаў асуджаная на 1 год і 6 месяцаў пазбаўлення волі.

*# Суд Першамайскага раёна г. Мінска 8 верасня 2023 г. вынес прысуд **Аляксандру Смірнову** з пакараннем тры гады пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. Да суда Аляксандр утрымоўваўся пад вартай. Згодна з версіяй абвінавачвання, Аляксандр Смірноў знаходзіўся ў нецвярозым стане, калі ў ноч на 19 чэрвеня 2023 г. "прадэманстраваў сваё абразлівае і блюзнерскае стаўленне да дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь". Аляксандр падчас суду не прызнаў сябе вінаватым. Ён распавёў, што зрываў сцягі, калі быў п'яны, таму што хацеў захаваць памяць пра сваё знаходжанне ў Беларусі і павесіць іх дома. Аляксандр адзначыў, што даў папярэднія сведчанні наконт гэтага эпізоду пад фізічным і маральным ціскам з боку супрацоўнікаў міліцыі. Смірноў распавёў, што падпаліў ўрну для смецця таксама выпадкова, калі кінуў туды непагашаны недакурак. Пасля гэтага ён патэлефанаваў у пажарную службу.*

*# У судзе Цэнтральнага раёна Мінска 20 верасня 2023 г. вынеслі прысуды тром палітвязням: стрыечнаму брату палітыка Паўла Латушкі* ***Анатолю Латушку****,* ***Ліліі Ананян*** *і* ***Алене Маліноўскай****. Іх затрымалі 31 студзеня 2022 г. за тое, што яны малявалі па трафарэце на паштовых скрынях у пад'ездах нацыянальны герб "Пагоня" , і змясцілі пад варту. Вядома, што пасля затрымання Анатоль быў моцна збіты. Іх асудзілі агулам паводле пяці артыкулаў КК за распаўсюд улётак да рэферэндуму, удзел у мірным шэсці, маляванне нацыянальнага герба "Пагоня", спаленне дзяржаўнага сцяга. У выніку суддзя Дзмітрый Карсюк асудзіў Анатоля да шасці гадоў пазбаўлення волі, Алену — да чатырох гадоў пазбаўлення волі, Лілію — да пяці гадоў абмежавання волі (жанчыну вызвалілі ў зале суда). Анатоля таксама аштрафавалі на 300 базавых велічыняў, і ён павінен кампенсаваць шкоду пацярпелым.*



### 4.7. Абвінавачванне ў тэрарызме і асуджэнне на працяглыя тэрміны пазбаўлення волі

Ад сакавіка 2023 года прынамсі 12 чалавек было затрымана паводле арт. 289 КК (Акт тэрарызму), з іх восем чалавек было асуджана; і як мінімум 11 чалавек было затрымана паводле арт. 290 КК (Пагроза здзяйсненнем акту тэрарызму), з іх шэсць чалавек было асуджана.

**Ёханэсбургскія прынцыпы**

**Прынцып 1. Свабода меркавання, самавыяўлення і інфармацыі**

*(d) Ніякія абмежаванні свабоды выказвання меркавання ці інфармацыі не могуць уводзіцца пад выглядам абароны нацыянальнай бяспекі, калі толькі ўрад не прадэманструе, што такое абмежаванне прадугледжана законам і неабходна ў дэмакратычным грамадстве дзеля абароны законных інтарэсаў нацыянальнай бяспекі.*

**Прынцып 24. Неадпаведныя пакаранні**

*За злачынствы, звязаныя з бяспекай, у якіх закрануты правы на свабоду выказвання меркавання і свабоду інфармацыі, пэўныя асобы, рэдакцыі СМІ, палітычныя і іншыя арганізацыі не могуць зазнаваць пакаранне, абмежаванні правоў ці санкцыі, якія неадпаведныя сур'ёзнасці здзейсненага злачынства.*

Хаця насамрэч Беларусь не знаходзіцца пад пагрозай міжнароднага тэрарызму[27], беларускія ўлады актыўна абвяшчаюць прадэмакратычных палітыкаў і грамадзянскіх актывістаў тэрарыстамі, а акты грамадзянскага непадпарадкавання прыраўноўваюць да тэрарызму. Гэта прасочваецца як у шэрагу заяваў вышэйшых службовых асобаў, гэтак і ў крымінальных справах аб дзяржаўнай здрадзе, спробе гвалтоўнага захопу ўлады і г. д.

*# **Павел Кучынскі**, былы вайсковец, асуджаны да 19 гадоў пазбаўлення волі паводле шэрагу абвінавачванняў, уключаючы арт. 289 КК (Акт тэрарызму). Дэталі абвінавачвання невядомыя.*

Прапагандысцкі фільм "Гаспар на сувязь не выйшаў"[28], быў паказаны 8 сакавіка 2023 г. на дзяржаўным тэлеканале і распавядае пра затрыманні асобаў, што абвінавачваюцца ў экстрэмізме і тэрарызме, у тым ліку за інцыдэнт на аэрадроме Мачулішчы. Зранку 26 лютага 2022 г. на аэрадроме Мачулішчы былі чуваць два выбухі. Паведамлялася, што пацярпеў вельмі каштоўны расійскі самалёт далёкай выведкі ДРЛВ А 50, які быў падарваны ў двух месцах. Ён выкарыстоўваўся дзеля навядзення расійскіх ракет на цэлі ва Украіне. КДБ 3 сакавіка паведаміў, што па справе праходзіць каля 30 чалавек. Супраць іх распачалі крымінальную справу згодна з ч. 3 арт. 289 КК (Акт тэрарызму, здзейснены арганізаванай гру-

[27] Даклад Спецыяльнай дакладчыцы ААН па Беларусі, A/HRC/53/53, п. 97.

[28] «"Толькі не забівайце, я ўсё скажу!" Падрабязнасці тэракту ў Мачулішчах: падрыхтоўка, рэалізацыя, хто замовіў і выканаў», Тэлеканал АНТ, 08 сакавіка 2023 г.

пай). Фігурантам крымінальнай справы дыверсіі ў Мачулішчах можа пагражаць выключная мера — смяротнае пакаранне[29]. Напрыканцы сакавіка і на пачатку красавіка супрацоўнікі КДБ праводзілі маштабную аперацыю па пошуку "дыверсантаў", у межах якой у дзясяткаў чалавек праходзілі вобшукі, іх дапытвалі і затрымоўвалі — у фокус сілавікоў трапілі тыя, хто зазнаваў адміністрацыйны пераслед з 2020 па 2023 год.

*# **Вадзіму Пацэнку**, затрыманаму за "падрыхтоўку дыверсій" паводле гэтай справы, выставілі шэраг абвінавачванняў, у тым ліку згодна з ч. 3 арт. 289 (Акт тэрарызму) і ч. 3 арт. 126 КК (Акт міжнароднага тэрарызму). У прапагандысцкім фільме заявілі, што ён нібы мусіў здзейсніць дыверсію ў Гродне. На кадрах допыту ён кажа, што яму "паставілі задачу падарваць нафтабазу з дапамогай дрона і выбухоўкі". Пры гэтым у наяўнай інфармацыі няма звестак пра рэальнае здзяйсненне тэрарыстычнага акту — ажыццяўленне скончанага злачынства.*

У межах абвінавачвання ў тэрарызме працягваецца пераслед ініцыятывы "BYPOL", прызнанай уладамі тэрарыстычнай арганізацыяй. Арганізацыя займаецца стварэннем незалежнага прафсаюза сілавых структур, распрацоўкай праекта рэформаў праваахоўных органаў, зборам доказаў злачынстваў сілавікоў супраць мірных пратэстоўцаў.

*# У Мінскім гарадскім судзе 15 лютага 2024 г. у межах спецыяльнай вытворчасці асудзілі заснавальнікаў і экс-удзельнікаў ініцыятывы "BYPOL": **Аляксандра Азарава**, **Матвея Купрэйчыка**, **Ігара Лобана**, **Андрэя Астаповіча**, **Уладзіміра Жыгара** і **Алега Талерчыка**. Суддзя Дзіна Кучук прызначыла фігурантам справы паводле 13 крымінальных артыкулаў ад 11 да 25 гадоў зняволення і штраф на агульную суму больш за 350 000 еўра.*

Гэтыя эпізоды ілюструюць, як выпадкі планаваных і ажыццёўленых актаў грамадзянскага непадпарадкавання (у большасці выпадкаў негвалтоўнага характару) раздзімаюцца да ўзроўню сур'ёзнай пагрозы нацыянальнай бяспецы ўсёй краіны. Такое пазіцыянаванне з'яўляецца часткай больш шырокай стратэгіі, пры якой адсутная пагроза міжнароднага тэрарызму не перашкаджае абвінавачванням у тэрарызме ў адрас прадэмакратычных палітыкаў і актывістаў, дэманструючы імкненне трактаваць акты грамадзянскага непадпарадкавання як тэрарыстычную пагрозу.

[29] Ад траўня 2022 года нават за замах на здзяйсненне злачынства, прадугледжанага ч. 3 арт. 126 КК (Акт міжнароднага тэрарызму), можа прысуджацца смяротнае пакаранне (першапачаткова такое пакаранне паводле ч. 3 арт. 126 КК было прадугледжана толькі за здзейсненае злачынства, якое пацягнула смерць чалавека).

## 4.8. Пераслед за распаўсюд "экстрэмісцкіх матэрыялаў", а таксама за выраб, выданне, захоўванне ці перавозку такіх матэрыялаў у мэтах распаўсюду

Палітычна матываваны пераслед, які разгарнуўся падчас і пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года, змяніў маштабы пераследу за распаўсюд і іншыя забароненыя дзеянні з так званымі экстрэмісцкімі матэрыяламі — інфармацыйнай прадукцыяй, занесенай у Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.

Доўгі час пераслед за гэтыя дзеянні насіў хутчэй эпізадычны характар: Праваабарончаму цэнтру "Вясна" ў 2015 годзе было вядома пра аднаго прыцягнутага да адміністрацыйнай адказнасці; у 2016 годзе — пра трох; у 2017-м — пра пяць; у 2018-м — пра дзесяць; у 2019-м — пра дванаццаць, у 2020-м — пра дзевяць выпадкаў асуджэння. Відавочна, гэта былі не ўсе разгледжаныя судамі справы, бо ў той перыяд шырока распаўсюджаным было ўключэнне ў пералік інфармацыйнай прадукцыі ксенафобнага, нацысцкага і неанацысцкага толку. Выпадкі пераследу за распаўсюд такога кшталту матэрыялаў у адсутнасць афіцыйнай статыстыкі маглі не станавіцца вядомымі праваабаронцам.

У 2021 годзе сітуацыя рэзка змянілася: ва ўмовах, калі пачаў змяншацца ўзровень адкрытага пратэсту, спецслужбы пачалі надаваць асаблівую ўвагу пошуку нязгодных і іншадумцаў. Тады ж адбыліся абвальныя працэсы прызнання экстрэмісцкімі матэрыяламі практычна ўсіх папулярных незалежных інфармацыйных рэсурсаў: 27 ліпеня — "Белсат", 13 жніўня — TUT.BY, напрыканцы года экстрэмісцкімі матэрыяламі прызналі Telegram-каналы і сацсеткі "Радыё Свабода" і "Нашай нівы". Праваабаронцам "Вясны" стала вядома пра больш як 150 выпадкаў асуджэнняў за 2021 год — галоўным чынам за знойдзеныя ў сетцы Інтэрнэт рэпосты з забароненых рэсурсаў. Варта адзначыць, што гэтая колькасць з'яўляецца далёка не поўнай, бо магчымасці для назірання ў судах істотна скараціліся.

У 2022 годзе праваабаронцам стала вядома пра больш як 800 выпадкаў пераследу паводле арт. 19.11 КаАП, у тым ліку пастановы судоў паводле больш як 400 справаў; у 2023 годзе — пра больш за 2 800 выпадкаў, у тым ліку пастановы судоў па больш як 1 000 справаў.

За год, які мінуў з напісання папярэдняй справаздачы, — з 1 сакавіка 2023 г. па 1 сакавіка 2024 г. — стала вядома пра больш за 3 320 выпадкаў прыцягнення да адказнасці паводле розных частак арт. 19.11 КаАП, а таксама пра вынікі больш як 1 170 з іх: суддзямі прызначаны 552 штрафы 327 грамадзянам і 622 адміністрацыйныя арышты 365 грамадзянам. Сярэдні памер штрафу склаў амаль 22 базавыя велічыні (каля 250 еўра), арышту — 11,5 сутак на кожны выпадак прыцягнення, або амаль 37 базавых велічыняў (каля 400 еўра) ці 19,6 сутак арышту на кожнага асуджанага чалавека.

Шырокі маштаб пераследу пацвярджаецца звесткамі, якія зрэдчас з'яўляюцца ў афіцыйных крыніцах: так, у 2023 годзе ў Гродзенскай вобласці за пяць месяцаў паводле арт. 19.11 КаАП да адказнасці былі прыцягнуты 243 чалавекі, у Гомельскай вобласці за 11 месяцаў — больш як 900 чалавек, раённымі (гарадскімі) судамі Магілёўскай вобласці за год разгледжана 455 справаў аб адміністрацыйных правапарушэннях паводле ч. 2 арт. 19.11 КаАП.

Дзяржаўныя ідэолагі папярэджваюць[30], што адказнасць пагражае не толькі за дзеянні, непасрэдна згаданыя ў дыспазіцыі артыкула 19.11 КаАП — нават падпіска на пратэсныя рэсурсы адвольна разглядаецца як правапарушэнне ў адсутнасць намеру на азнаямленне іншых асобаў з забароненым кантэнтам: *"варта ведаць, што падпіска — гэта элемент папулярызацыі, распаўсюду экстрэмісцкай інфармацыі, г. зн. захоўванне ў адкрытым доступе ў сетцы Інтэрнэт (на асабістых старонках у сацыяльных сетках або мэсэнджарах Viber, Telegram і г. д.) спасылак на Telegram-каналы (чаты), уключаныя ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў, расцэньваецца як захоўванне з мэтай распаўсюду, што прадугледжвае адміністрацыйную адказнасць, прадугледжаную ч. 2 арт. 19.11 КаАП. Акрамя таго, розная прапаганда — "зліў" звестак, рэпосты, каментары, аказанне падтрымкі ў папулярызацыі канала, фінансаванне — гэта цягне у цяперашні час адміністрацыйную адказнасць"*.

Яны таксама папярэджваюць пра сістэматычнасць такога кантролю за інфармацыйнай прасторай: *"Дэананімізаваць праваахоўнікі на сёння могуць практычна любога, сучасныя камп'ютарныя праграмы дазваляюць гэта зрабіць, кантралююцца і правяраюцца, у тым ліку, і розныя дамавыя чаты"*.

**Васіль Палякоў** — актывіст з Гомеля, які адбыў 30 сутак адміністрацыйнага арышту ў лістападзе 2023 года і зноў быў затрыманы 23 студзеня 2024 года. Пасля гэтага ён быў тройчы асуджаны да 15 сутак адміністрацыйнага арышту запар паводле ч. 1 арт. 19.11 КаАП (Распаўсюд інфармацыйнай прадукцыі, уключанай у рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў, а таксама выраб, выданне, захоўванне ці перавозка ў мэтах распаўсюду такой інфармацыі) і змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання. У перыяд арышту быў прызнаны праваабарончай супольнасцю палітвязнем.

Такім чынам, пераслед за свабодны распаўсюд інфармацыі часта дасягае ўзроўню крымінальнага, санкцыі маюць рысы крымінальных, часта ўжываюцца з парушэннем прэзумпцый і працэсуальных гарантый.

---

[30] Матэрыялы для сябраў інфармацыйна-прапагандысцкіх груп (чэрвень 2023 г.) "Аб мерах процідзеяння экстрэмізму і тэрарызму, рэабілітацыі нацызму, адказнасць за рэгістрацыю на інтэрнэт-рэсурсах, прызнаных экстрэмісцкімі, і распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў у глабальнай сетцы Інтэрнэт". Матэрыял падрыхтаваны Упраўленнем унутраных спраў Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта, Пракуратурай Гродзенскай вобласці, Упраўленнем следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Гродзенскай вобласці; аналагічныя матэрыялы, распаўсюджаныя ў Гомельскай вобласці.

### 4.9. Пераслед за рэабілітацыю нацызму, прапаганду ці публічнае дэманстраванне, выраб, распаўсюд нацысцкай сімволікі і атрыбутыкі, а таксама захоўванне або набыванне такой сімволікі ці атрыбутыкі ў мэтах распаўсюду; пераслед за адмаўленне генацыду беларускага народа

Ва ўмовах ператварэння праваахоўных органаў і судоў у інструмент пераследу паводле палітычных матываў ужо не выклікае здзіўлення той факт, што нормы закона, закліканага стаць на абарону дзяржавы ад магчымага рэваншу нацысцкіх ідэй, выбарча і мэтанакіравана выкарыстоўваюцца супраць нязгодных і іншадумцаў. Аналіз Законаў "Аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму" і "Аб генацыдзе беларускага народа", зроблены ў папярэднім дакладзе, прыводзіць да высноваў пра наяўнасць у іх перадумоваў для маніпуляцыі паняццямі і гістарычнай праўдай у інтарэсах адвольнага абвінавачвання.

За год, што мінуў пасля публікацыі папярэдняга дакладу, колькасць асуджаных паводле арт. 130-1 КК, які прадугледжвае адказнасць за рэабілітацыю нацызму, павялічылася з аднаго (яшчэ адзін чалавек быў асуджаны за рэабілітацыю нацызму, але паводле арт. 130 КК, што тлумачыцца асаблівасцямі кваліфікацыі) да дзевяці.

Непаўналетні **Мікіта Бруй**, а таксама **Вячаслаў Гацман**, **Вадзім Рудкоўскі**, **Аляксандр Румко** былі асуджаны ў закрытым судовым пасяджэнні, што пазбаўляе магчымасці дакладна выказацца наконт абгрунтаванасці выстаўленых абвінавачванняў. Аднак звяртае на сябе ўвагу той факт, што, акрамя абвінавачвання паводле арт. 130 КК, усе, акрамя Вадзіма Рудкоўскага, абвінавачваліся таксама паводле іншых пратэсных складаў злачынстваў.

Акалічнасці і падставы асуджэння **Рэната Крыўко**, **Аляксея Кузьміна** і **Анатоля Місніка** невядомыя.

Таксама за нанясенне на розных паверхнях у роднай вёсцы надпісаў і выяваў свастыкі да трох гадоў пазбаўлення волі быў асуджаны паводле арт. 130-1 і ч. 2 арт. 339 КК за рэабілітацыю нацызму і злоснае хуліганства **Аляксандр Плескацэвіч**. У адпаведнасці з абвінавачваннем, надпісы *"Слава фюрару"*, *"Усю ўладу бандэраўцам"*, *"Нашы героі Адольф Гітлер, Сцяпан Бандэра"* варта лічыць "рэабілітацыяй нацызму", г. зн. складам злачынства паводле ч. 1 арт. 130-1 КК, а астатнія надпісы (*"Смерць лукашыстам"*, *"Помста"*, *"Імя мне легіён"*, з ненарматыўнай лексікай) і ўласна выявы свастыкі — паводле ч. 2 арт. 339 КК.

Разам з тым, у адпаведнасці з законам, рэабілітацыя нацызму — дзеянні, зробленыя публічна або з выкарыстаннем публічна дэманстраванага твору, ці сродкаў масавай інфармацыі, ці глабальнай камп'ютарнай сеткі Інтэрнэт, ці іншай інфармацыйнай сеткі, якія выяўляюцца ў:

- апраўданні ідэалогіі (дактрыны) і практыкі нацызму, прызнанні іх правільнымі, вартымі падтрымкі і пераймання, а таксама ў распаўсюдзе ідэалогіі нацызму;
- ухваленні ці адмаўленні злачынстваў супраць міру і бяспекі чалавецтва, ваенных і іншых злачынстваў, вызначаных прысудам Міжнароднага ваеннага трыбунала або прысудамі нацыянальных, ваенных ці акупа-

цыйных трыбуналаў, заснаванымі на прысудзе Міжнароднага ваеннага трыбунала;

- апраўданні асобаў і (ці) структур або арганізацый, прызнаных злачыннымі або вінаватымі ў здзяйсненні злачынстваў прысудам Міжнароднага ваеннага трыбунала або прысудамі нацыянальных, ваенных ці акупацыйных трыбуналаў, заснаванымі на прысудзе Міжнароднага ваеннага трыбунала, а таксама палітычных і ваенных арганізацый, якія супрацоўнічалі з такімі асобамі і (ці) структурамі або арганізацыямі на акупаванай тэрыторыі СССР у гады Другой сусветнай вайны, а таксама асобаў, якія ўдзельнічалі ў дзейнасці такіх палітычных і ваенных арганізацый і выконвалі або наўмысна садзейнічалі выкананню злачынных загадаў асобаў і (ці) структур або арганізацый, згаданых у гэтым абзацы, у любой форме;
- гераізацыі нацысцкіх злачынцаў і іх памагатых — наўмысным праслаўленні іх, а таксама здзейсненых імі злачынстваў.

У справе Плескацэвіча, як бачна, з вялікай нацяжкай склад злачынства мог быць угледжаны толькі паводле прыкметаў наўмыснага ўслаўлення нацысцкіх злачынцаў і іх памагатых. Разам з тым ёсць абгрунтаваныя сумневы ў тым, што выказванні *"Слава фюрару"*, *"Усю ўладу бандэраўцам"* маюць непасрэдныя і бясспрэчныя адносіны да нацызму, а выказванне *"Нашы героі Адольф Гітлер, Сцяпан Бандэра"* нясе ў сабе ўсе рысы паняцця ўсхвалення. Варта таксама адзначыць, што Сцяпан Бандэра і бандэраўцы не з'яўляюцца прызнанымі нацысцкімі злачынцамі або іх памагатымі. У кожным разе пазбаўленне волі на тэрмін тры гады нельга расцэньваць як дапушчальнае прапарцыйнае абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў.

На пачатку сакавіка 2023 года МУС заявіла пра затрыманне **Андрэя Савіцкага**, якога абвінавацілі ў адмаўленні генацыду беларускага народа згодна з арт. 130-2 КК, а таксама ў арганізацыі і падрыхтоўцы дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўным удзеле ў іх, абразе Лукашэнкі, рэабілітацыі нацызму.

Сутнасць дзеянняў, за якія Савіцкага абвінавацілі ў адмаўленні генацыду беларускага народа, зводзілася да каментавання псеўдагістарычнай публікацыі з альтэрнатыўнай версіяй гібелі жыхароў д. Хатынь. Савіцкі, як відаць, з даверам паставіўся да зместу артыкула і прывёў некалькі ўласных довадаў-здагадак на карысць гэтай версіі.

### 4.10. Публічныя заклікі да экстрэмізму, а таксама публічнае апраўданне такіх дзеянняў

Заклікі да экстрэмісцкіх дзеянняў і публічнае апраўданне экстрэмізму ў адпаведнасці з законам "Аб процідзеянні экстрэмізму" з'яўляюцца асобнымі праявамі экстрэмізму. Асобныя формы такіх дзеянняў прызнаныя злачынствамі і за іх вызначаная крымінальная адказнасць. У прыватнасці, крыміналізаванае публічнае апраўданне тэрарызму (арт. 289-1 КК) — звестак аб вынесеных прысудах праваабаронцы не маюць; заклікі да мер абмежавальнага характару (санкцый), іншых дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь (арт. 361 КК).

У адпаведнасці з арт. 361 КК, караюцца "публічныя заклікі да захопу дзяржаўнай улады, ці гвалтоўнай змены канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, ці здрады дзяржаве, ці здзяйснення акту тэрарызму ці дыверсіі, ці ажыццяўлення дзеянняў, накіраваных на парушэнне тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь, ці здзяйснення іншых дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь, у тым ліку на ўжыванне мер абмежавальнага характару (санкцый) у дачыненні да Рэспублікі Беларусь, фізічных і юрыдычных асобаў Рэспублікі Беларусь, або распаўсюд матэрыялаў, якія змяшчаюць такія заклікі, пры адсутнасці прыкметаў больш цяжкага злачынства". Павышаная адказнасць вызначаная за заклікі, звернутыя да замежнай дзяржавы, замежнай ці міжнароднай арганізацыі, ажыццявіць дзеянні, накіраваныя на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь, у тым ліку на ўжыванне мер абмежавальнага характару (санкцый) у дачыненні да Рэспублікі Беларусь, фізічных і юрыдычных асобаў Рэспублікі Беларусь, або распаўсюд матэрыялаў, якія змяшчаюць такія заклікі", а таксама за здзяйсненне ўсіх пералічаных у дыспазіцыі дзеянняў з выкарыстаннем сродкаў масавай інфармацыі ці глабальнай камп'ютарнай сеткі Інтэрнэт, або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, або пры надыходзе цяжкіх наступстваў.

Найбольш папулярным з'яўляецца абвінавачванне ў закліках да санкцый. Агулам, згодна са звесткамі праваабаронцаў, паводле арт. 361 КК з 2020 года асуджана не менш за 100 чалавек.

Таксама крыміналізаваны публічныя заклікі да арганізацыі ці правядзення незаконных сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў, дэманстрацый ці пікетаванняў або ўцягванне асобаў ва ўдзел у такіх масавых мерапрыемствах (арт. 369-3 КК). Гэтыя дзеянні, здзейсненыя шляхам гвалту, пагрозы ўжывання гвалту, падману ці выплаты ўзнагароды, або іншая арганізацыя ці правядзенне такіх масавых мерапрыемстваў, калі іх правядзенне пацягнула па неасцярожнасці гібель людзей, прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання аднаму ці некалькім асобам ці прычыненне шкоды ў буйным памеры, караюцца арыштам, ці абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, ці пазбаўленнем волі на той жа тэрмін

Звестак аб прыцягненні да адказнасці паводле гэтага артыкулу ў праваабаронцаў няма.

Разам з тым, заклікі да ўдзелу ў вулічных пратэстах часта кваліфікуюцца як арганізацыя масавых беспарадкаў паводле ч. 1 арт. 293 КК ці як арганізацыя групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, паводле ч. 1 арт. 342 КК.

Суд Кастрычніцкага раёна Гродна вынес прысуд **Сяргею Ботвічу**, абвінавачыўшы яго ў масавых беспарадках паводле ч. 1 арт. 293 Крымінальнага кодэкса. Мужчыну затрымалі на пачатку студзеня 2023 года і змясцілі ў СІЗА. Тады ў адным з праўладных Telegram-каналаў з'явіўся ролік з затрыманнем супрацоўнікамі ГУБАЗ і АМАП жыхара Гродна, які нібы адміністраваў дваровыя чаты, сярод якіх "Гродна Цэнтр 97%", удзельнічаў у пратэсных мітынгах і заклікаў іншых удзельнічаць у іх, а таксама ўжываць гвалт у дачыненні да міліцыянтаў, літаральна "паліць аўтазакі".

Згодна з матэрыяламі абвінавачвання, Сяргей Ботвіч у месэнджары Telegram, з'яўляючыся актыўным удзельнікам чата "Гродна 97%", *"з мэтай арганізацыі масавых беспарадкаў, распальваючы ў карыстальнікаў мэсэнджара Telegram рашучасць удзелу ў масавых беспарадках… ажыццяўляў перапіску ў асабістым чаце з нявызначаным карыстальнікам аб неабходнасці ўдзелу ў масавых беспарадках, якія суправаджаюцца знішчэннем і пашкоджаннем маёмасці, транспартных сродкаў супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, падпаламі, гатовасці выкарыстання пры здзяйсненні злачынных дзеянняў бутэлек з запальнай сумессю (кактэйль Молатава), пры гэтым не давёў свой злачынны намер, накіраваны на арганізацыю масавых беспарадкаў, да канца"*.

Ботвіч у судзе сваю віну прызнаў часткова, а экспертка — дацэнтка кафедры рускай філалогіі мясцовага ўніверсітэта А. — растлумачыла суду, што пакінутыя ім каментары ў сукупнасці з каментарамі, размешчанымі да і пасля складзеных ім тэкставых паведамленняў, падахвочваюць да новых відаў пратэсту, грубага і жорсткага сілавога іх рашэння.

Суд прызначыў Ботвічу пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін пяць гадоў з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму.

## 5. Спецыяльная вытворчасць

Крымінальна-працэсуальны кодэкс 20 ліпеня 2022 г. быў дапоўнены[31] раздзелам 49-3 "Спецыяльная вытворчасць". Змены набылі моц праз 7 дзён — 27 ліпеня 2022 г. Ад моманту прыняцця закона да 1 сакавіка 2024 г. з 69 чалавек, у дачыненні да якіх была распачатая спецыяльная вытворчасць, толькі двое абвінавачваюцца не паводле "экстрэмісцкіх" артыкулаў Крымінальнага кодэкса — такім чынам можна меркаваць, што гэты інструмент створаны дзеля пераследу палітычных апанентаў рэжыму і іншадумцаў.

Спецыяльная вытворчасць праводзіцца па наступных падставах у сукупнасці:

1. паўналетні грамадзянін Рэспублікі Беларусь;
2. знаходзіцца за межамі Беларусі;
3. абвінавачваецца ў здзяйсненні асобных злачынстваў супраць міру, бяспекі чалавецтва і ваенных злачынстваў[32], супраць грамадскай бяспекі[33], дзяржавы, бяспекі руху і эксплуатацыі транспарту[34], здароўя насельніцтва[35], дзяржавы[36] і іншых[37];
4. замежнай дзяржавай адмоўлена ў выдачы абвінавачанага для ажыццяўлення крымінальнага пераследу або на працягу шасці месяцаў з моманту накіравання Генеральнай пракуратурай органу замежнай дзяржавы просьбы аб выдачы асобы для ажыццяўлення крымінальнага пераследу не атрымана згода замежнай дзяржавы на выдачу абвінавачанага.

Інфармацыя аб правядзенні спецыяльнай вытворчасці публікуецца на сайтах Следчага камітэта[38] і Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь[39]. Такім чынам, каб атрымаць звесткі пра распачатую супраць чалавека крымінальную справу, а таксама пра суд, неабходна самастойна маніторыць сайты.

Праз два месяцы — 26 верасня 2022 г. — былі апублікаваны звесткі аб пачатку першай спецыяльнай вытворчасці ў дачыненні да **Яніны Сазановіч**, **Дзмітрыя Навошы**, **Валерыі Занямонскай**, **Вольгі Высоцкай**, **Данііла Багдановіча** паводле абвінавачвання ў здзяйсненні злачынстваў, прадугледжаных ч. 3 арт. 130, ч. 3 арт. 203-1 КК.

---

[31] Закон № 199-З "Аб змене Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь" ад 20 ліпеня 2022 г.

[32] Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, арт. 122–137.

[33] Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, арт. 289, ч. 2 арт. 290, арт. $290^1$-293, ч. 4 арт. 294, ч. 4 арт. 295.

[34] Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, ч. 4 арт. 309, ч. 3 арт. 311.

[35] Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, ч. 3 арт. 311, ч. 3 арт. 322, ч. 3 арт. 323, ч. 3 арт. 324, ч. 2 арт. 333.

[36] Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, арт. 356–361.

[37] Згодна з пастановай генеральнага пракурора ці асобы, якая выконвае яго абавязкі, або старшыні Следчага камітэта, старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі ці асобаў, што выконваюць іх абавязкі, і са згоды генеральнага пракурора ці асобы, якая выконвае яго абавязкі, спецыяльная вытворчасць можа праводзіцца ў іншых выпадках (ч. 3 арт. 468-25 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь).

[38] Следчы камітэт Рэспублікі Беларусь, Спецыяльная вытворчасць.

[39] Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь, Спецыяльная вытворчасць па крымінальных справах.

**Заўвагі агульнага парадку № 32**

*36. У пункце 3 d) артыкула 14 утрымоўваюцца тры асобныя гарантыі. Па-першае, гэты пункт патрабуе, каб асобам, якія абвінавачваюцца ў крымінальным злачынстве, было дадзена права быць асуджанымі ў іх прысутнасці. Судовыя разгляды ў адсутнасць абвінавачаных могуць быць пры некаторых акалічнасцях дапушчальнымі ў інтарэсах належнага адпраўлення правасуддзя, напрыклад у тых выпадках, калі абвінавачаныя, хоць і апавешчаныя пра судовы разгляд дастаткова загадзя, адмаўляюцца ажыццяўляць сваё права быць асуджанымі ў іх прысутнасці. Такім чынам, падобныя судовыя разгляды сумяшчальныя з пунктам 3 d) артыкула 14, толькі калі робяцца неабходныя крокі для своечасовага выкліку абвінавачаных у суд і своечасовага іх інфармавання адносна даты і месца суда і з патрабаваннем прысутнічаць.*

У адпаведнасці з ч. 1 арт. 468-27 КПК, інфармацыя аб правядзенні спецыяльнай вытворчасці ў дачыненні да абвінавачанага, выкліку абвінавачанага ў орган крымінальнага пераследу размяшчаецца на афіцыйным інтэрнэт-сайце органа крымінальнага пераследу не пазней за адзін працоўны дзень з даты прыняцця адпаведнага рашэння.

У Пераліку асобаў, у дачыненні да якіх распачатая спецыяльная вытворчасць і якія выклікаюцца ў орган крымінальнага пераследу, налічваецца 69 чалавек. У дачыненні да 45 чалавек папярэдняе расследаванне скончана.

Самы кароткі тэрмін папярэдняга расследавання — 8 дзён[40]. Крымінальная справа была распачата паводле арт. 342 КК, які не згадваецца ў спісе пералічаных артыкулаў у п. 1 ч. 2 арт. 468-25 КПК. Аднак, паводле ч. 3 арт. 468-25 КПК, згодна з пастановай генеральнага пракурора ці асобы, якая выконвае яго абавязкі, або старшыні Следчага камітэта, старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі ці асобаў, што выконваюць іх абавязкі, і са згоды генеральнага пракурора ці асобы, якая выконвае яго абавязкі, спецыяльная вытворчасць можа праводзіцца ў іншых выпадках, то бок сукупнасць умоваў, акрэсленых у ч. 2 арт. 468-25 КПК, выконваць няма неабходнасці.

Згодна з ч. 2 арт. 468-27 КПК, пасля паступлення ў суд крымінальнай справы, паводле якой у дачыненні да абвінавачанага вынесена пастанова аб правядзенні спецыяльнай вытворчасці, інфармацыя пра дату, месца і час прызначэння судовага разгляду, выклік абвінавачанага ў суд[41], вынікі разгляду крымінальнай

[40] Згодна з Пералікам асобаў, у дачыненні да якіх распачата спецыяльная вытворчасць і якія былі выкліканы ў орган крымінальнага пераследу, № 59-60, 62-67, асобы абвінавачваюцца ў актыўным удзеле ў групавых дзеяннях, што груба парушаюць грамадскі парадак і спалучаны з явўным непадпарадкаваннем законным патрабаванням прадстаўнікоў улады і пацягнулі парушэнне працы транспарту, прадпрыемстваў, установаў пры адсутнасці прыкметаў больш цяжкага злачынства (ч. 1 арт. 342 КК).

[41] Вярхоўны суд, Аб прызначэнні судовага разгляду па крымінальнай справе паводле абвінавачвання Жылачкінай (Жываглод) А. М., Лібера П. І., Марыніча П. М., Дабравольскага А. А. у здзясненні злачынства, прадугледжанага ч. 2 арт. 191 КК, 1 сакавіка 2024 г.

справы[42], прызначанае судом пакаранне і (ці) ужыванне іншых мер крымінальнай адказнасці падлягае размяшчэнню на інтэрнэт-партале судоў агульнай юрысдыкцыі Рэспублікі Беларусь не пазней за адзін працоўны дзень з даты прыняцця адпаведнага рашэння.



## О назначении судебного разбирательства по уголовному делу по обвинению Соловьёва Д.С. в совершении преступлений, предусмотренных ч.4 ст.228, ч.2 ст.342 УК Республики Беларусь

22 ДЕКАБРЯ 2022 👁 262

22.12.2022

Суд Ленинского района г.Минска вызывает **Соловьёва Дмитрия Сергеевича**, 26 мая 1973 года рождения, в отношении которого вынесено постановление о проведении специального производства, в качестве *обвиняемого* в совершении преступлений, предусмотренных ч.4 ст.228, ч.2 ст.342 Уголовного кодекса Республики Беларусь, к **11.00 часам 5 января 2023 г.** по адресу: г.Минск, ул.Семашко, д.33.

Обвиняемому при себе иметь документ, удостоверяющий личность.

Неабходна адзначыць, што, згодна з ч. 5 арт. 468-25 КПК, удзел абаронцы абавязковы з моманту вынясення (узгаднення пракурорам) пастановы аб правядзенні спецыяльнай вытворчасці.

Звычайна абаронцу прызначае следчы з ліку адвакатаў тэрытарыяльнай калегіі адвакатаў. Шматлікія абвінавачаныя не валодаюць інфармацыяй аб тым, хто ў іх абаронца: у адкрытым доступе імя адваката не публікуецца. Гэта прыводзіць да немагчымасці атрымання абвінавачаным копій самых важных працэсуальных дакументаў па справе, у тым ліку тых, што ўтрымліваюць сутнасць абвінавачвання, бо асаблівасць спецыяльнай вытворчасці палягае ў тым, што *"копіі працэсуальных дакументаў, якія падлягаюць уручэнню абвінавачанаму, за выключэннем працэсуальных дакументаў, у якіх утрымліваюцца звесткі, што ўяўляюць дзяржаўныя сакрэты, а таксама апавяшчэнні, што закранаюць яго правы і інтарэсы, накіроўваюцца абаронцу абвінавачанага"*[43].

У той жа час адвакаты-абаронцы звязаныя дадзенымі органу расследавання падпіскамі аб неразгалошванні даных папярэдняга расследавання і не перадаюць падабаронным звестак па справе, справядліва асцерагаючыся далейшага пераследу. Наогул пытанні ўзаемаадносінаў абаронцы з абвінавачаным у спецыяльнай вытворчасці засталіся неўрэгуляванымі, а адпаведныя агульныя нормы КПК і заканадаўства аб адвакатуры ў гэтым выпадку непрымяняльныя; дзеянні абаронцы без уліку ці насуперак пазіцыі падабароннага па крымінальнай справе супярэчаць закону і сутнасці ўзаемаадносінаў паміж адвакатам і кліентам.

[42] Вярхоўны суд, Інфармацыя аб выніках разгляду крымінальнай справы.
[43] Крымінальна-працэсуальны кодэкс, ч. 4 арт. 468-27.

**Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах**

**Артыкул 14**

*3. Кожны мае права пры разглядзе любога выстаўленага яму крымінальнага абвінавачвання як мінімум на наступныя гарантыі на аснове поўнай роўнасці:*

*d) быць асуджаным у яго прысутнасці і абараняць сябе асабіста ці з дапамогай абранага ім самім абаронцы; калі ён не мае абаронцу, быць праінфармаваным пра гэта права і мець прызначанага яму абаронцу ў любым такім выпадку, калі інтарэсы правасуддзя таго патрабуюць, бязвыплатна для яго ў любым такім выпадку, калі ў яго няма дастаткова сродкаў для аплаты гэтага абаронцы.*

**Даклад Спецыяльнай дакладчыцы па пытанні аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі, A/78/327**

*58. Спецыяльная дакладчыца настойвае на тым, што ў адпаведнасці з міжнародным правам правоў чалавека правядзенне завочных судовых працэсаў магчыма толькі ў выключных акалічнасцях і пры строгім выкананні працэсуальных гарантый, якія, як вядома, у Беларусі былі зведзены на нішто (гл. A/75/173), у тым ліку ў выніку пераследу адвакатаў, практыкі правядзення судовых працэсаў у закрытым рэжыме, сістэматычных забаронаў на разгалошванне інфармацыі, адсутнасці незалежнасці суддзяў наогул і палітычна матываваных і па сутнасці неабгрунтаваных расследаванняў.*

## Высновы

Праваабарончы цэнтр "Вясна" працягвае маніторынг парушэнняў правоў чалавека; атрыманыя звесткі няўмольна сведчаць аб глыбокай прорве паміж заканадаўствам і міжнароднымі стандартамі, замацаванымі ў абавязковых для Беларусі дакументах універсальнага характару. Грубае парушэнне асноўных прынцыпаў права становіцца паўсядзённай рэальнасцю; праваахоўныя органы, пракуратура і суд страцілі ўласцівыя ім рысы і ператварыліся ў сляпы інструмент рэпрэсій. Аналіз заканадаўства аб процідзеянні экстрэмізму і барацьбе з тэрарызмам агаляе сістэмныя праблемы, якія дазваляюць таталітарнай уладзе карэнным чынам сказіць сэнс і сутнасць гэтай барацьбы і перанакіраваць высілкі на задушэнне свабоды меркаванняў і іх выказвання пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам.